ГАЗЭТА БЕЛАРУСАЎ У ВОЛЬНЫМ СЬВЕЦЕ ЦАНА — PRICE ¢ 50

Беларус

BIELARUS — BYELORUSSIAN NEWSPAPER IN THE FREE WORLD
POST ADDRESS: BIELARUS, P. O. BOX 109, JAMAICA, N. Y. 11431, Tel.: AX 1-8038

Год XX. № 161 Нью Ёрк Верасень — September 1970 New York Vol. XX. № 161

9-АЯ СУСТРЭЧА БЕЛАРУСАЎ ПАЎНОЧНАЕ АМЭРЫКІ

„БЕЛАРУСЬ У ЗМАГАНЬНІ"

ПАДСУМОЎВАЮЧЫ...

„Я, брат, падрос на цэлых дзесяць інчаў", сказаў адзін суродзіч у панядзелак 7-га верасьня сёлета, разьвітваючыся у Нью-Ёрку перад зваротным 900-кілямэтравым падарожжам назад у Клілэнд пасьля трохдзённае Сустрэчы Беларусаў ЗША і Канады. „Падрос", уздужаў духам, трэба думаць, кажны з удзельнікаў гэтае Сустрэчы, хоць ці-адзін і стаміўшыся, бо працы, клопатаў стала на ўсіх — і тых, што былі занятыя безьлічай прабыгчых арганізацыйных праблемаў, і тых, хто не даспаў і засяязеўся ў даўгой дарозе да Нью-Ёрку. Важна аднак, што ўсё прайшло памысна. Сустрэча, паводля перакананьня ейных удзельнікаў, удалася — і надзор'ем (магло, праўда, быць крыху халаднейя), і лікам удзельнікаў (каля 300 чалавек), і арганізацыйнай справнасьцяй, і атрыманымі прывітаньнямі, і зьместам выступленьняў, і, галоўна, тым маральным ды палітычным эфэктам, ад якога ўздужалася „на цэлых дзесяць інчаў".

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ БОК

Галоўныя ўправы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня й Згуртаваньня Беларусаў Канады ўлажылі ў Сустрэчу больш за дзесяць месяцаў інтэнсыўнага пляна-ваньня й каардынаваньня. Высілак аплаціўся. Вяручы агульна, Сустрэча была, думаецца, аднэй з найлепш праведзеных — дзякуючы ў ладнай меры арганізацыйным здольнасьцям, стараннасьці й такту ў дачыненьнях зь людзьмі старшыні Галоўнае Управы БАЗА інж. Вячаслава Станкевіча, а таксама энэргічнага сяброў Галоўных Управаў БАЗА і ЗБК ды ахвярнай працавітасьці ўсіх супрацоўнікаў мясцовых аддзелаў абедзьвюх арганізацыяў.

Добрай і важнай вонкавай дэталяй праведзеньня Сустрэчы была ейная эмблема (задуманая й выкананая сп. Барысам Данілюком), якую можна было пабачыць на друкаваных беларускіх і ангельскіх праграмах-запросінах, уступных білетах ды нагрудных жэтонах: у крузе на фоне шчыта — спалучэньне мяча й еўфрасіньнеўскага крыжа ды расьсечаны ім ланцуг; угары паангельску напіс „Беларусь у змаганьні!", уніззе, таксама паангельску — „9-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі".

Арганізацыйнай навіной сёлетняе Сустрэчы было й тое, што на ёй ня толькі слухаліся прамовы й рэзалюцыі, але праваліся працоўныя сэсіі-нарады на дзьве незвычайна актуальныя тэмы: выдавецтва й беларускага ўзгадаваньня моладзі.

БЕЛАРУСКАЕ ВЫДАВЕЦТВА

Першым праграмавым пунктам Сустрэчы была нарада-дыскусія ў сыботу папаўдні ў залі Беларускага Грамадзкага Цэнтру (БГЦ) над пытаньнямі: 1. англамоўнага бюлетэню; 2. гістарычна-моўнага часапісу; 3. пашырэньня выданьняў; і 4. кніжнага выдавецтва. У нарадзе, якую кіравалі сп.сп. Я. Запруднік і Б. Данілюк, узяло ўдзел каля 25 чалавек. Часу на гэтыя часаёмкія тэмы было, праўда, не зашмат (тры гадзіны), а паглядаў, праектаў ды прапановаў — дай Божа, колькі. Тым ня менш, кажнаму з прысутных стала ясна, што ёсьць рэчы неадкладныя. Асабліва востра пастае пытаньне англамоўнага бюлетэню, што інфармаваў-бы ўрады й грамадзтвы заходніх краёў (у тым ліку й ладна каго з англамоўнае моладзі беларускага паходжаньня) пра сучасны стан беларускае справы ды ход падзеяў на Беларусі.

У выніку дыскусіяў была абраная камісія з трох асобаў, што разгледзіць дэтальна тыя ўмовы, у якіх можна было-б наладзіць выданьне англамоўнага месячнага бюлетэню, ды падасьць пра гэта Галоўным Управам БАЗА й ЗБК ды Прэзыдыюму Рады БНР.

З прыхільнасьцяй сустрэлі ўдзельнікі нарады заяву др. Я. Станкевіча пра свой намер выдаваць гістарычна-моўны часапіс. Др. Я. Станкевіч заклікаў усіх да супрацоўніцтва ў гэтай важнай справе.

Што да пашырэньня беларускіх і беларусаведных выданьняў, нарада пастанавіла зьвярнуцца да Управаў БАЗА і ЗБК з прапановай наладзіць, дзе можна, дзейнасьць кіёскаў і паштовае службы продажу беларускіх выданьняў.

У пытаньні кніжнага выдавецтва праблема стала тымчасам на прапанове сп. Б. Данілюка стварыць асобную выдавецкую супалку, што дзейнічала-б як самастойная арганізацыйная адзінка.

БЕЛАРУСКАЕ ЎЗГАДАВАНЬНЕ МОЛАДЗІ

У сыботу ўвечары ў залі БГЦ адбылася першая людная імпрэза Сустрэчы: рэфэрат і дыскусія на тэму „Беларускае ўзгадаваньне моладзі", а пасьля — вечар мастацкае самадзейнасьці.

Адчыніў вечар, вітаючы ўсіх, сп. Мікола Кунцэвіч, старшыня акругі БАЗА Нью-Ёрк. Віталі ўдзельнікаў Сустрэчы сп.сп. Алесь Грыцук, старшыня ГУ ЗБК, і В. Станкевіч, старшыня ГУ БАЗА.

Прысутныя ў залі БГЦ з асалодай агледалі багатую выстаўку абразоў беларускага мастака ў Нью-Ёрку Пётры Мірановіча, што, наладжаная Беларускім Інстытутам Навукі й Мастацтва, шчасьліва супала з 9-ай Сустрэчай ды ўпрыгожыла залю БГЦ і ўзбагаціла ўсю атмасфэру беларускага зьезду.

Др. Вітаўт Тумаш, старшыня БІНіМ, даў кароткую інфармацыю пра жыцьцёвы й творчы шлях сп. Пётры Мірановіча.

Др. Вінцэнт Жук Грышкевіч у сваім грунтоўна прадуманым рэфэраце на тэму беларускага ўзгадаваньня моладзі, зрабіўшы кароткі агляд благога стану беларускага школьніцтва на эміграцыі, выставіў наступныя прапановы: 1. Справу ўзгадаваньня моладзі „трактаваць як агульна нацыянальную справу, а не як справу толькі бацькоў, што маюць дзяцей"; 2. „Стварыць усеагульную культурнаасьветную арганізацыю, якая займалася-б прапагаваньнем арганізацыі школаў ды зьбірала-б грошы на гэта"; 3. „Стварыць арганізацыю беларускіх вучыцялёў"; 4. „Стварыць Беларускую Школьную Раду для ўсіе нашае эміграцыі як кіруючы орган у школьнай і асьветнай справе"; 5. „Стварыць агульнабеларускі школьны й культурнаасьветны грашовы фонд".

Дыскусія на закранёную тэму выявілася вельмі жвавая. У цэнтры яе стала выбуховае пытаньне: што важнейшае ў працэсе ўзгадаваньня — родная мова ці вера пра Беларусь (хоць і не ў беларускай мове). Агню ў спрэчкі з самага пачатку далі сваімі розьнымі паглядамі на пытаньне ўзгадаваньня сп.сп. Я.Запруднік і Я. Станкевіч. З дыскусіі, што пачалася ў сыботу ды працягвалася гадзін тры ў панядзелак, вывялася, што адна катэгорыя дыспутантаў (абаронцы першынства ролі роднае мовы—хоць наагул падзел гэты вельмі ўмоўны й базаваўся ў поўнай меры на непаразуменьні) складалася з асобаў старэйшых векам, а другая — з маладшых ці, дакладней кажучы, сярэдніх векам (канфлікт пакаленьняў?). У кажным разе, сталася вельмі дабрачым — і гэта добра — што пытаньне беларускага ўзгадаваньня моладзі, як ніякая іншая тэма, узбуджае запал, эмоцыі, жарсьць. Гэты запал пачуцьцяў, трэба верыць, стане ў добрай прыгодзе ў шуканьні канкрэтных шляхоў выхаду зь цяжкога й пагразьлівага працэсу асыміляцыі моладзі.

Вельмі прыхільна ў дыскусіі пра моладзь было сустрэтае выступленьне спадарычны Ванды Гайдзелянкі з Чыкага. На канкрэтным прыкладзе свае працы ў гуртку моладзі яна праілюстравала, што часамі, каб магчы трымаць моладзь згуртаванай, калі сярод яе трапляюцца адзінкі без патрэбнага веданьня беларускае мовы (а гэткія ўсюды ёсьць), дык з мусу трэба карыстацца ангельскаю моваю, каб утрымаць гуртоК дзеля іншых формаў беларуска-грамадзкае й беларускавернае дзейнасьці.

Уся дыскусія на тэму ўзгадаваньня моладзі, у сыботу і ў панядзелак, таксама паказала, як шмат каштоўных думак могуць выказаць пранятыя гэтай праблемай грамадзяне. Трэба спадзявацца, што праблема беларускага ўзгадаваньня, актуалізаваная 9-й Сустрэчай, знойдзе свой здаровы й рэчовы водгук на балонах газэты „Беларус".

ВЕЧАР САМАДЗЕЙНАСЬЦІ

Мастацкая самадзейнасьць ці, як назваў яе сп. Гіпаліт Паланевіч, што вёў далейшую праграму вечару, мастацкая саматужнасьць, дапоўніла сыботнюю сустрэчу. Праграма складалася зь песьняў у выкананьні сп-ні Вольгі Алёшынай зь Лёнг-Айлэнду (дзьве народныя й раманс „Ля ракі") пад акардыён сп. Кастуся Жыдаловіча, чытаньня ўрыўкаў з нарысу Ул. Караткевіча „Званы ў прадонні вазёр" (чыталі: Раіса Станкевіч, Ніна Запруднік і Юрка Курыла), ды песьняў і музыкі сп. К. Жыдаловіча, пад якія, пры чарцы й закусцы, закончыўся першы дзень Сустрэчы.

БАГАСЛУЖБА

У нядзелю 6-га верасьня ў катэдральным саборы сьв. Кірылы Тураўскага адбылася ўрачыстая багаслужба, якую адслужылі Уладыкі Андрэй і Мікалай у суслужэньні аа. Віктара й Карпа ды архідыякана М. Страпка. Уладыка Андрэй у сваім казаньні, зварачаючыся да вернікаў, што зьехаліся з далёкіх канцоў сьвету ў імя сьвятой справы паняволенага народу, адзначыў збаўленую сілу любасьці да бліжняга й духовае абнаўленьне ад прынесеныя ахвяры — тым больш, калі любасьць і ахвярнасьць сьвіроўваюцца цэламу сваяму народу, што цярпіць у ланцугох бязбожніцкае няволі.

Сулагна пяяў у большым чымся зьвычайна складзе хор пад дырыгентствам сп. Міхася Тулейкі.

АКАДЭМІЯ Ў ГАТЭЛІ „БІЛТМОР"

Пасьля адсьпяваньня амэрыканскага гімну ды малітвы Уладыкі Андрэя старшыня сходу сп. Я. Запруднік перадаў слова др. В. Жук-Грышкевічу, Старшыні Рады БНР. Ад імя Рады БНР і свайго асабістага прамоўца прывітаў удзельнікаў 9-ае Сустрэчы, скліканае пад знакам „Беларусь у змаганьні!" Лёзунг гэты, казаў др. В. Жук-Грышкевіч, вызначыла сама сытуацыя Беларусі ў ярме чырвонага расейскага каляніялізму, вызначылі яго й абавязкі эміграцыі ў дачыненьні да свае бацькаўшчыны. Прэзыдэнт Рады БНР заклікаў усіх да выконаньня заданьняў, што ўскладзеныя на нас фактам перабываньня ў вольным сьвеце: перахоўваць нацыянальную спадчыну й дзяржаўныя традыцыі, рыхтаваць кадры для справы ўжыцьцёўленьня ідэалаў 25 Сакавіка, інфармаваць вонкавы сьвет пра эканамічную эксплёатацыю й русыфікацыю Беларусі, мацаваць адзінства й салідарнасьць, як аснову здабыцьця дзяржаўнае незалежнасьці.

З кароткім заклікам да прысутных зьвярнуўся пасьля гэтага др. Станіслаў Станкевіч, галоўны рэдактар газэты „Беларус", адзначаючы вялікую ролю друкаванага слова ў жыцьці эміграцыі ды заклікаючы ўсіх даць ахвяру на выдавецтва „Беларуса" ў раскладзеныя на залі адмысловыя канвэрты. (Сабраныя пасьлей у часе перапынку ахвяры прынесьлі выдавецтву газэты 607 даляраў, пра што др. Ст. Станкевіч абвесьціў сходу пад агульны выяў задаваленьня.).

Зь цёплымі й шчырымі словамі прывітаньня выступіў на акадэміі Кангрэсмэн-Рэспубліканец Сэймур Гальпэрн зь Нью-Ёрку (выбарная акруга Квінс) — „даўны прыяцель Беларусаў, адзін з выдатных заканадаўцаў у Вашынгтоне на працягу 12-ёх гадоў і станоўкі абаронца правоў паняволеных народаў", як прадставіў яго сходу старшыня Я. Запруднік.

У сваім выступленьні кангрэсмэн С. Гальпэрн даў вельмі трапную характарыстыку палажэньня на Беларусі, якая ў выніку русыфікацыі апынілася пад пагрозай „культурнага генацыду", ды сказаў, што тым, хто жыве ў Амэрыцы й Канадзе — адзіны шлях змаганьня із злом расейскае няволі гэта няўтомна праводзіць далей дзейнасьць праз гэткія свае арганізацыі, як БАЗА і ЗБК. (Поўны тэкст прамовы кангрэсмэна С. Гальпэрна гл. у іншым месцы гэтага нумару).

З прамовай-асэнсаваньнем лёзунгу Сустрэчы — „Беларусь у змаганьні" — выступіў сп. Антон Адамовіч. Прамоўца даў глыбокі аналіз гістарычных абставінаў нацыянальна-адраджэнскага змаганьня беларускага народу, прааналізаваў псыхалёгію й пастуляты гэтага змаганьня, схарактарызаваў мэтады нацыянальнае самаабароны ды вызначыў межы, у якіх вялося й вязецца (ды павінна весьціся) гэтае супраць усіх тых пагрозаў, якія беларускі народ на бацькаўшчыне й мы на чужыне сустракаем, як апрычоная этнічна-нацыянальная адзінка. (У наступных нумарох нашае газэты, спадзяёмся, прамова сп. Ант. Адамовіча будзе надрукаваная.)

ПРЫВІТАНЬНІ ЎДЗЕЛЬНІКАМ СУСТРЭЧЫ

У водказ на разасланыя запросіны, 9-й Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі быў прысланы цэлы шэраг пісьмовых прывітаньняў ад палітычных дзеячоў ЗША, Канады ды беларускіх арганізацыяў.

Агульны сэнс прывітаньняў добра можна было-б схарактарызаваць словамі губэрнатара штату Нью-Ёрку Нэльсана Рокэфэлера, у тэлеграме якога, між іншага, казалася: „Свобода, як гэта вам усім добра ведама, рэч дарагая, што часамі ня поўнасьцяй ацэньваецца тымі, хто заўсёды карыстаецца гэтаю свабодай. Трэба вітаць вас за тое, што вы нагадваеце пра гэтую жыцьцёва важную акалічнасьць ды канцэнтруеце ўвагу грамадзтва Паўночнае Амэрыкі на пакутах нашых братоў і сёстраў, што жывуць у паняволеных краёх. Зычу памысьнасьці. Прадаўжайце сваю добрую справу".

9-ую Сустрэчу Беларусаў Паўночнае Амэрыкі віталі губэрнатары: Вільям Т. Кэйгіл (штат Нью Джэрзі), Вільям Г. Мілікэн (Мічыган), Волтэр Пэтэрсан (Нью Гампшыр), Рэйманд П. Шэйфэр (Пэнсыльванія), мэр гораду Нью Ёрку Джон В. Ліндзы; сэнатары: Джэйкаб К. Джэвіц, Чарльз Э. Годэл (із штату Нью Ёрк), Эдмунд С. Маскі (Мэйн), Эйб Рыбікоф (Канэктыкат), Маргарэт Чэйс Сміт (Мэйн), Эдвард Даблю Брук (Масачусэтс), Чарльз МкЦ Мат'ясс Малодшы (Мэрылэнд), Гю Скот (Пэн.). Словы сэнатара Скота: „Змаганьне за незалежнасьць Беларусі — гэта змаганьне за вызваленьне ўсіх паняволеных народаў. Імкненьне беларускага народу да нацыянальнае свабоды ніколі ня будзе здушанае. Ваша справа справядлівая. Няхай-жа ўсе Амэрыканцы моляцца за вашую ўдачу.".

Былі атрыманыя таксама прывітаньні ад кангрэсмэнаў: Джона М. Мэрфі (Нью-Ёрк), Джона Даблю Вайдлера (Нью-Ёрк), Майкла А. Фіена (Агаё), Эдварда Джэй Патэна (Нью Джэрзі), Робэрта Джэй Тафта, Малодшага (Агаё), Пітэра Даблю Родына (Нью Джэрзі), ад сп. Алэна, старэйшага ўрадавага прадстаўніка Службы Сувязі на Цэнтральную Канаду, сп. Эдмунда Гейбы Ксэвіера з Арлеанскага ўнівэрсытэту.

Зь беларускіх арганізацыяў і ўстановаў прыслалі прывітаньні: аддзел БАЗА ў Нью Брансьвіку (Я. Азарка — старш., В. Стома — сакрат.), аддзел БАЗА ў Дэтройце (Тацяна Пляскач — старш.), Сэкітар Рады БНР у Аўстраліі (М. Нікан — сакр.), Беларускі Цэнтральны Камітэт у Вікторыі, Аўстралія (М. Скабей — за ўправу), Беларускае Аб'еднаньне ў Новай Паўдзённай Валіі (інж. Мікола Караневускі — старш.), Згуртаваньне Беларусаў Вялікабрытаніі (Янка Міхалюк — старш., Алесь Лашук — сакр.), Беларуская Бібліятэка і Музэй імя Францішка Скарыны ў Лёндане

(Заканчэньне на 2-ой бачыне)

СЭНАТАР Р. СЬМІТ І БЕЛАРУСЫ



Сэнатар Ралф Т. Сьміт канфэруе з М. Жызьнеўскім, прадстаўніком ад Беларусаў і старшынём Беларускай Рэспубліканскай групы штату Іліной

3-га лістапада сёлета адбудуцца ў паасобных штатах Амэрыкі выбары ў штатавыя ўрады і ў Кангрэс ЗША з удзелам моладзі ад 18 год. Беларусы ўсіх палітычных кірункаў штату Іліной пастанавілі сёлета аддаць свае галасы на Сэнатара Ралфа Т. Сьміта й на іншых кандыдатаў Рэспубліканскага сьпіску.

Сэнатар Р. Т. Сьміт, выконваючы функцыі сэнатара ад штату Іліной з канстытуцыйнага вызначэньня пасьля сьмерці Сэнатара Э. Дэрксэна, выявіў сябе зь як найлепшага боку ў самых сучасных скамплікаваных абставінах у Амэрыцы ды зьвяртаў вялікую ўвагу на справы паняволеных бальшавізмам народаў, у тым ліку й беларускага народу. Ён выступаў 25 сакавіка сёлета з адмысловай прамовай у Сэнаце ЗША, адзначаючы 52-я ўгодкі абвешчаньня дзяржаўнае незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі. Ён пры кажнай нагодзе трымае кантакт зь беларускімі прадстаўнікамі штату Іліной ды спагадна ставіцца да беларускіх арганізацыяў і нашых нацыянальных патрэбаў. У ягонай асобе Амэрыка будзе мець дзейнага й разумнага сэнатара, а Беларусы свайго вялікага прыяцеля.

BIELARUS

Byelorussian Newspaper in the Free World
Published monthly by
BYELORUSSIAN-AMERICAN ASSOCIATION, Inc.,
166 — 34 Gothic Drive, Jamaica, N. Y. 11432.
Subscription $ 6.00 yearly.

„БЕЛАРУС" —Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце
Выходзіць месячна. Рэдагуе Калегія.
Выдае: Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне
Выпіска зь перасылкаю — 6 дал. на год.

РЭЗАЛЮЦЫЯ

9-ае СУСТРЭЧЫ БЕЛАРУСАЎ ПАЎНОЧНАЕ АМЭРЫКІ У НЬЮ ЁРКУ 5-7 ВЕРАСЬНЯ 1970 Г.

ЗАТЫМ, што беларускі народ на сваёй зямлі знаходзіцца ў каляніяльнай залежнасьці ад Расеі; што

расейска-камуністычная дыктатура, у сваіх канцахтах з суседзямі Беларусі, адарвала ад савецкае беларускае дзяржавы частку беларускага этнаграфічнага прастору, улучыўшы пры гэтым найбольш яго ў межы самое расейскае рэспублікі —РСФСР; што

на адказных становішчах у БССР стаіць пераважна насланы Масквой чужы элемэнт, абыякавы да матар'яльных і культурных патрэбаў беларускага жыхарства; што

беларускі народ цярпіць ад неймавернa нізкога ўзроўню матар'яльнага жыцьця ў выніку эксплаатацыі прыродных багацьцяў і людзкое сілы краю, выкарыстоўваных на фінансаваньне маскоўскае імпэрыялістычнае экспансіі ў Лацінскай Амэрыцы, Індакітаі, Афрыцы, а цяпер асабліва на Блізкім Усходзе, ды ў іншых частках сьвету; што

на Беларусі праводзіцца гвалтам русыфікацыйная палітыка ўва ўсіх дзялянках жыцьця краю, беларуская мова выцiскаецца штораз больш з адміністрацыі, навукі, школьніцтва й выдавецтва БССР; што

Беларусь ня мае свабодных міжнародных дыпляматычных і культурных кантактаў, ейнае адзінае замежнае прадстаўніцтва ў Задзіночаных Нацыях — толькі прылада маскоўскае палітыкі, а ўдзел у іншых міжнародных падзеях (як, прыкладам, Алімпійскія спартыўныя гульні) недаступны БССР, як самастойнай адзінцы; што

ўрад Беларускае ССР, поўнасьцяй кантраляваны маскоўска- партыйным цэнтрам, ня рупіцца пра палепшаньне палітычнага статусу ды матар'яльнага й духовага дабрабыту беларускага народу, не дамагаецца спыненьня эканамічнае эксплаатацыі ў русыфікацыйнае ўціску; што

беларускі народ ніколі не пагаджаўся й не пагаджаецца з гэткай каляніяльнай залежнасьцяй, а ставіць бязупынна й наважана супраць Маскве ў вабароне сваіх законных правоў быць поўным гаспадаром свае зямлі; што

Беларусь усьцяж жыве ў змаганьні —

Мы, Беларусы Задзыночаных Штатаў Амэрыкі й Канады, заяўляем і дакляруем, што будзем і надалей як найактыўней падтрымліваць змаганьне беларускага народу за сваю дзяржаўную незалежнасьць, будзем спрыяць гэтаму змаганьню ўсімі нашымі сілaмі ды шукаць падтрыманьня змагарнай Беларусі сярод дзяржаўных і палітычных дзейнікаў краёў нашага пасяленьня аж пакуль ня будзе адноўленая на Беларусі свабода й дэмакратыя згодна з пастулятамі й прынцыпамі, сфармуляванымі ў устаўных граматах Беларускае Народнае Рэспублікі, свабода й незалежнасьць якое былі абвешчаныя ў Менску 25 сакавіка 1918 году.

Жыве Беларусь у змаганьні!

Жыве Беларуская Народная Рэспубліка!

Нью-Ёрк, 6 верасьня 1970 г.

Я. Запруднік, старшыня Сходу

В. Станкевіч, старшыня Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня

А. Грыцук, старшыня Згуртаваньня Беларусаў Канады

(Рэзалюцыю Беларусаў Паўночнае Амэрыкі зьмясьціў у „Конгрэшэнал Рэкорд" — „Запісах Кангрэсу ЗША" — за 22. IX. 1970 Кангрэсмэн-Дэмакрат Джон Мэрфі із Статэн Айлэнду, штат Нью Ёрк.).

ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАГА УЗГАДАВАНЬНЯ

ЗАПРОСІНЫ ДА ДЫСКУСІІ

Пастаўленая на парадак дня 9-ае Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі тэма беларускага ўзгадаваньня моладзі выразна паказала, што справа гэтая войстра актуальная й набалелая ўсім ды што блізу кажны хоча й мае штосьці сказаць на гэтую тэму. І гэта зразумела: пытаньне ўзгадаваньня нашае моладзі — гэта перш-наперш пытаньне нас самых, сярэдніх і старэйшых векам, пытаньне, галоўны сэнс якога зводзіцца да наступнага: ці мы, як палітычная эміграцыя, далі рады з найгалоўнейшым сваім заданьнем — забясьпечыць прадоўжаньне тае культурнае й нацыянальнае дзейнасьці, у якой існасьць усяго нашага йснаваньня, як грамады, у якой сіла, што трымае нас разам. Пытаньне беларускага ўзгадаваньня — гэта ў васноўным пытаньне, ці за наступныя 20-30 год эміграцыйнага йснаваньня будзе йшчэ з каго выбіраць сяброў управы тае ці іншае нашае грамадзкае арганізацыі, ці будуць прыхаджане ў нашых цэрквах, слухачы на нашых рэфэратах, прадстаўнікі ў дэлегацыі да мясцовых уладаў. Гэта пытаньне ўсяе нашае будучыні, нашага быцьця або нябыцьця, як беларускае нацыянальнае групы. Ці дзіва, што гэтак былі ўсхадзіліся жарсьці ў дыскусіі на тэму беларускага ўзгадаваньня ў часе 9-ае Сустрэчы. І ў тэй шчырай ухвалявнасьці, зь якой дыскусія вялася — добры знак жыцьця. Вось чаму рэдакцыя „Беларуса" ставіць гэтую праблему на шырэйшае абмеркаваньне, запрашаючы ўсіх да абмену думак. Мы перакананыя, што нашыя чытачы маюць шмат чаго цікавага сказаць на тэму ўзгадаваньня моладзі, грунтуючыся на сваім собскім дазнаньні й назіраньнях. Мы перакананыя, што з гэтых выказваньняў шмат хто скарыстае пасярэдня й беспасярэдня. У нас ёсьць пімала дасьветчаных падагогаў ды бацькоў, што маюць багатае дазнаньне ў справе ўзгадаваньня дзяцей. Якія цяжкасьці ў іх? Якія шляхі пераадольваньня гэтых цяжкасьцяў? Якія пытаньні ў самых? Якія парады іншым? Праз бацькоў, тых, у каго ўжо дарослыя дзеці, мы зварачаемся й да гэных дзяцей, часта з вышэйшай асьветай, з просьбай выказацца на тэму беларускага ўзгадаваньня. Што думаюць яны пра ўсё гэта? Можа гэта дапаможа наладзіць ды пашырыць дыялёг старэйшага пакаленьня аднае культуры з малодшым пакаленьнем, што вырасла ў умовах беларуска-англамоўнага двукультур'я. Дарэчы, калі хто з малодшых мае завялікія цяжкасьці зь беларускаю мовaю, няхай піша тэй мовaю, што яму найлягчэйшая — у рэдакцыі зробіцца беларускі пераклад. Чым больш удзельнікаў у дыскусіі, тым цікавей і карысьней. У некаторых аддзелах БАЗА маглі-б бышь праведзеныя адмысловыя сходы дзеля абмеркаваньня гэтае тэмы з тым, што ў рэдакцыю газэты былі-бы прысланы пераказ або запіс выказаных думак. Словам, запросіны да ўдзелу ў вабмеркаваньні гэтае важнае праблемы пасылаюцца ўсім і кажнаму. Чакаем, Паважаныя Чытачы, на Вашае слова ў гэтым важным пытаньні.

ПАВАЖАНЫЯ СУРОДЗІЧЫ

Газэта „Беларус" выдаецца за дабраахвотныя ахвяры беларускага грамадзтва. Таму не павінна быць ніводнага Беларуса, які-б атрымліваў і чытаў нашую газэту задарма.

Таксама не павінна быць ніводнага Беларуса, які-б не атрымліваў і ня чытаў нашай газэты.

9-АЯ СУСТРЭЧА БЕЛАРУСАЎ ПАЎНОЧНАЕ АМЭРЫКІ

(Заканчэньне зь 1-ае бачыны)

(а. Аляксандар Надсон), Беларуская Каталіцкая Місія Бізантыйска-Славянскага Абраду ў Ангельшчыне (а. Я. Гэрмановіч), Беларускі Клюб у Манчэстары (М. Яськевіч—сакр.), Саюз Беларусаў у Бэльгіі (а. Аўген Смаршчок — старш.), Беларусы Льежу ў Бэльгіі (П. Барысік — упаважнены), Згуртаваньне Беларусаў Францыі „Хаўрус" (а. Л. Гарошка — сакр.).

АСАБІСТЫЯ ПРЫВІТАНЬНІ

Удзельнікам Сустрэчы прыемна было вітаць у сябе асабістых прадстаўнікоў прыязных арганізацыяў іншых нацыянальнасьцяў у Амэрыцы: сп. Івана Крамарэнку, галаву Прадстаўніцтва Украінскае Народнае Рэспублікі на Амэрыку, сп. Ёзэфа Паўча, прадстаўніка Славацкае Лігі ў Амэрыцы й рэдактара газэты „Славак у Амэрыцы", сп. Мірона Леськіва, старшыню Рэспубліканскае Фэдэрацыі Нацыянальнасьцяў у штаце Нью Джэрзі. Усе пералічаныя асобы выступілі з прывітаньнямі із словамі прызнаньня й салідарнасьці ў супольным змаганьні з камуністычнымі паняволынікамі.

З красамоўнай прамовай выступіў перад удзельнікамі Сустрэчы сп. Лясьлё Пастар, дырэктар Аддзелу Нацыянальнасьцяў пры Нацыянальным Камітэце Рэспубліканскае Партыі ў Вашынгтоне. Перад тым, як сп. Пастар прамаўляў, др. Ст. Станкевіч, старшыня Беларуска-Рэспубліканскага Клюбу ў штаце Нью Ёрк і дараднік Аддзелу Нацыянальнасьцяў, паінфармаваў пра выдатную арганізацыйную дзейнасьць сп. Пастара на сваім сучасным становішчы.

Сп. Л. Пастар адзначыў нявымерную вартасьць свабоды, якою ўмеюць даражыць тыя, хто паспрабаваў камуністычнага татальнага ўціску (сам Пастар —удзельнік вугорскага вызвольнага паўстаньня 1956 году), адзначыў вялікую арганізацыйную й маральную вартасьць для нацыянальных групаў гэткіх мерапрыемстваў, як 9-я Сустрэча Беларусаў, ды заклікаў да супольнага высілку Беларусаў ЗША і Канады разам з усімі іншымі нацыянальнасьцямі ў змаганьні з камуністычным хвалышам і паняволеньнем.

РЭЗАЛЮЦЫЯ И ПРЫВІТАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ

Тэкст рэзалюцыі паангельску прачытала сп-чна Ванда Гайдзеляна (рэзалюцыю пабеларуску гл. у іншым месцы гэтага нумару), пасьля чаго рэзалюцыя была прынятая праз акламацыю.

Акламацыяй былі таксама прынятыя прывітальныя тэлеграмы Прэзыдэнту ЗША Ніксану, Прэм'еру Канады Трудо, Віцэ-Прэзыдэнту ЗША Агню, дырэктарам Юнайтэд Стэйтс Інформэйшэн Эйджэнсы і „Голасу Амэрыкі" ды рэдактару часапісу „Нэшэнал Рэвю" сп. Вільяму Баклі ў Нью Ёрку. Ува ўсіх прывітаньнях, за выняткам Прэм'ера Трудо, галоўная ўвага ўзятая на канечнасьць патрэбы наладжаньня перадачаў „Голасу Амэрыкі" на Беларусь у беларускай мове.

КАНЦЭРТ

У канцэртнай частцы нядзельнае акадэміі ўзялі ўдзел: піяністка кампазытар Эльза Зубковіч (выканала дзьве собскія кампазыцыі й п'есу фінскага кампазытара Мэлартына „Ідылія"), сапрана Надзея Градэ-Куліковіч (два рамансы й арыя „Кацярына" камп. М. Куліковіча), Ніна Запруднік (піяніна, вакальны на тэму „Чаму-ж мне ня пець?" камп. Э. Зубковіч), квінтэт у складзе Алы Орса-Романо, Галіны Орсы, Веры Бартуль, Алы Курыла ды Гаі Тэдон (зь песьнямі „Вось і пау ужо змрок", „Як сарву я ружы кветку" ды „Цераз сад-вінаград"); дэкляматары Юрка Драздоўскі (з карэйскім вершам-байкай „Праўдзівы хлопчык" у перакладзе Ул. Дубоўкі) і Раіса Жук-Грышкевіч (зь вершам Л. Геніюш „Дзяды"); маладзежны танцавальны гурток Нью Джэрзі — Нью Ёрку (з танцамі „Лявоніха" й „Мікіта").

Слухачы й гледачы вельмі цёпла ўспрымалі кажны нумар праграмы, шчодра ўзнагароджваючы выканаўнікаў воплескамі.

Старшыня ГУ БАЗА сп. В. Станкевіч падзякаваў усім за добрае супрацоўніцтва, а старшыня ГУ ЗБК сп. А. Грыцук абвесьціў месца наступнае 10-ае Сустрэчы — Таронта ў Канадзе — ды запрасіў усіх на гэную сустрэчу.

Адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну „Мы выйдзем шчыльнымі радамі" пры ўрачыстым прыўзьнятым настроі ўдзельнікаў закончылася кульмінацыйная частка Сустрэчы — сход-акадэмія ў гатэлі „Білтмор".

Нельга не дадаць тут, што на працягу акадэміі, у паралельнай зь „Мюзык Рум" праходнай залі адбывалася выстаўка беларускіх і беларусаведных выданьняў, старанна зрыхтаваная сп. А. Шукелайцем. Выстаўка выконвала важную функцыю паказу беларускага высілку ў галіне пашырэньня веды пра Беларусь друкам і дакумэнтаваньня беларускага жыцьця.

„ВЯЛІКІ БАЛЬ"

Укаранаваньнем і адпружаньнем (за выняткам, праўда, тых, што былі адказныя за арганізацыйны бок правядзеньня балю; а клопатаў і з гэтым было ціадным) быў г. зв. „Грэнд Бол" — „Вялікі Баль" у тым-жа „Білтморы", толькі ў большай залі („Боўмэн Рум").

На балі было чалавек дзьвесьце. Гулялі весела. Аркестра Лявона Рудзінскага спадабалася ўсім бяз вынятку. Стол з кактэйлем-закускай задавольніў таксама ўсіх. На пітво абмежаньняў ня было, за выняткам цэнаў.

Баль, апрача выпіўкі й танцу, складаўся таксама і з выбару „каралевы". Камісія, на чале із сп. М. Кунцэвічам, мела, кажуць, цяжкасьць з выбарам. Гэтулькі было прыгожых дзяўчат і маладзіцаў! А як кажа нямецкая пагаворка: „Ваальл іст кваль" — выбар гэта боль. Ды ўсё-ж камісія із сваім заданьнем дала рады ды прыйшла да шчасьлівае пастановы прызнаць „карону" прыгожай і грамадзка актыўнай сп-чні Ваньдзе Гайдзелянцы з Чыкага.

Калі па поўначы ўдзельнікі балю разыходзіліся-разьвітваліся, закончыўшы вечарыну „Лявоніхай", дык было відаць, што бальшыня зь іх адчувала як гэная маладзіца, што заявіла пры стале сваёму суседу: „Ніколі йшчэ ў жыцьці гэтак ня гулялася!"

Але-ж, гулялася добра, бо папрацавалася добра. Пра гэта варта памятаць тым, што будуць адказныя за арганізацыю наступнае Сустрэчы ў Таронце ды тым — і асабліва тым — да каго гэныя арганізатары будуць зварачацца па дапамогу. Бо адно напорысты й добра зладжаны агульны высілак можа даць гэткія вынікі, якія запісаныя цяпер на конта арганізатараў 9-ае Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі.

Аркадзь Будзіч

ТЭЛЕГРАМА ПРЭЗЫДЭНТУ ЗША

Ад імя й з даручэньня 9-ае Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі была высланая тэлеграма Прэзыдэнту ЗША Рычарду Ніксану наступнага зьместу:

September 8, 1970

The President of the United States
The White House
Washington, D. C.

Mr. Prsident:

The participants of the 9th Biennial Convention of Byelorussians of North America held in New York City on September 5, 6, and 7, 1970, wish to convey to you their warm greetings and best wishes for every success in your quest for an honorable peace in Indochina and stability in the world. We support and applaud your firm stand in defense of freedom for the nations, among them the Byelorussian nation, enslaved by dark forces of Communism.

Knowing how important the moral factor is in any struggle of a people for their freedom, we once again ask you, Mr. President, to review the present policy of non-inclusion of the Byelorussian language in the Voice of America broadcasts. Spoken in the Soviet Union by over eight million people, according to the official Soviet count, and being an important means of communication in Soviet Byelorussia, the Byelorussian language if included in VOA broadcasts will earn the gratitude and goodwill of Byelorussians in the Soviet Union for America.

Respectfully yours,
Jan Zaprudnik
Chairman of the Convention

Тэлеграма падобнага зьместу была высланая таксама й Віцэ-Прэзыдэнту ЗША Сьпіро Агню.

ТЭЛЕГРАМА ДЗЯРЖАЎНАМУ САКРАТАРУ ЗША

З даручэньня й ад імя 9-ае Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі была высланая тэлеграма Дзяржаўнаму Сакратару (міністру замежных справаў) ЗША Вільяму П. Роджэрсу наступнага зьместу:

September 8, 1970

Hon. William P. Rogers
The Secretary of State
State Department
Washington, D. C.

Dear Sir:

The participants at the 9th Biennial Convention of Byelorussians of North America held in New York City on September 5, 6, and 7, 1970, wish to convey to you their greetings and best wishes in your noble efforts at securing peace and friendship for the United States among the peoples of the world.

We take this opportunity, Sir, to call your attention of the fact that the people in Soviet Byelorussia as well as the Byelorussian-Americans are still waiting and hoping for inclusion of the Byelorussian language in Voice of America broadcasts. The Russification drive that we are witnessing in Soviet Byelorussia has elicited widespread resistance on the part of the Byelorussian people. The Byelorussian language is an important means of communication in Soviet Byelorussia, especially in the field of propaganda. We are convinced, therefore, that it is of great importance to the U. S. Government and American interests to include the Byelorussian language among those broadcast by VOA to fully tap the immense reservoir of goodwill among the Byelorussian people in the Soviet Union towards the United States.

Respectfully yours,
Jan Zaprudnik
Chairman of the Convention

Тэлеграмы падобнага зьместу былі йшчэ высланыя наступным асобам, ад якіх беспасярэдня залежыць пытаньне ўвядзеньня беларускае мовы ў перадачах Радыя Голасу Амэрыкі:

1. Frank Shakespeare, Director of the USIA, 1776 Pennsylvania Ave., N. W., Washington, D. C.; 2. Kenneth R. Giddens, Director of the VOA, 330 Independence Ave., S. W., Washington, D. C.; 3. William F. Buckley, Jr., 150 East 35 Street, New York City, N. Y.

З ЦАРКОЎНАГА ЖЫЦЬЦЯ У АДЭЛЯЙДЗЕ

У парахвіі БАПЦ у Адэляйдзе (Аўстралія) адбыўся 29 жніўня сёлета агульны гадавы перавыбарны сход. Пасьля справаздачаў старое Царкоўнае Рады й дыскусіяў над імі была выбраная новая Царкоўная Рада ў наступным складзе: Я. Піўневіч — старшыня, В. Леваноўіч — сакратар, М. Бурнос —скарбнік, А. Шаравіч — сябра, вонкавых дачыненьні — Янка Рольсан. Рэвізійная Камісія выбраная ў гэткім складзе: У. Акавіты, К. Станкевіч і К. Ранцэвіч.

А. М.

ПРАМОВА КАНГРЭСМЭНА С. ГАЛЬПЭРНА

Спадару Прэзыдэньце, Спадару Старшыня, Вашыя Дастойнасьці, мае суграмадзяне й шчыра вітаныя сяброве з Канады!

Гэта так жыцьцёва йстотна, каб Вы й надалей пасьвячалі сябе справе змаганьня за векаіснасьць Беларусі. Гэта так важна ўсьцяж прыгадваць сваю слаўную спадчыну, свае гістарычныя поўныя характва традыцыі ды адначасна рэагаваць на хібныя цьверджаньні й чыстую ману, крыкліва пашыраную па сьвеце савецкім рэжымам.

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка паводля свае канстытуцыі — сувэрэнная палітычная адзінка ў складзе Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублікаў. Згодна з савецкай канстытуцыяй Беларусь мае фармальныя адзнакі дзяржаўнасьці: свой собскі ўрад, тэрытарыяльную юрысдыкцыю, дзяржаўны сьцяг і пячатку. Фармальна беларускі народ мае права адлучацца ад СССР у кажным часе, калі ён знойдзе, што ягонае сяброўства ў складзе „сацыялістычнай супольні" больш яму непажаданае. Сябра Задзіночаных Нацыяў ад 1945 году, Беларуская рэспубліка цешыцца ў гэтай арганізацыі роўным статусам зь іншымі дзяржавамі сьвету, у тым ліку й з самым Савецкім Саюзам. У паперах беларускага міністэрства замежных справаў знаходзяцца ўгоды, умовы й пагадненьні зь іншымі дзяржавамі. Але беларускія патрыёты на выгнаньні ведаюць пра ашуканства, што хаваецца за гэтай зманнай дзяржаўнасьцяй. Яны ўсьведамляюць сабе, што фікцыя беларускага фэдэралізму — гэта спадчына раньняга бальшавізму, калі слабы йшчэ новы рэжым знаходзіў дамэтным надаваць нейкі выгляд на сувэрэннасьць нерасейскім нацыянальнасьцям, адвечным ахвярам царскага каляніялізму. Але Беларусь ня можа быць сувэрэннай дзяржавай датуль, пакуль яна „сацыялістычная" й „савецкая". Запраўды, БССР была ашуканствам ад самага ейнага стварэньня. Бальшавікі не заснавалі, як на гэта яны прэтэндуюць, беларускае дзяржавы. Яны захапілі яе. На другі год па бальшавіцкай рэвалюцыі яны наваліліся на Рэспубліку, абвешчаную Актам Беларускае Незалежнасьці 25 сакавіка 1918-га году. Пры дапамозе жмені беларускіх калябарантаў бальшавікі абвесьцілі 1-га студзеня 1919-га году сваю собскую „беларускую рэспубліку". Але гэтая фікцыя ня можа прыхаваць факту веннага падбіцьця й акупацыі. Кажны аб'ектыўны Беларус глядзіць на сваю бацькаўшчыну як на паняволеную дзяржаву зь гісторыяй падзелаў яе паміж Польшчай і Расеяй, акупацыяй трэйцім Райхам, а тады зноў — Савецкім Саюзам. Навет як этнаграфічную адзінку, Беларускую Рэспубліку падзяліла Масква паміж Польшчай, Літвой, Расеяй і Украінай.

Найбольш, аднак, Беларусаў гнясце хіба павольная, ды сьведамая савецкая палітыка дэнацыяналізацыі беларускага народу. Беларускія патрыёты спадзяюцца, што беларуская самаіснасьць будзе перахаваная ў беларускай культуры, як-бы ні абмежавалі яе да фармалізацыі савецкага шляху жыцьця. Ды па гадох гвалтоўнае асыміляцыі беларуская культура пачынае занікаць. Беларускую мову рэдка чуваць на вуліцах і ўрадавых установах Менску. Вышэйшая асьвета ў БССР ужо ад каторага часу вядзецца ў расейскай мове. Родная беларуская мова выганяецца цяперака із сярэдніх ды пачатковых школаў. Кнігарні ня ў стане задавальняць заказаў на беларускую літаратуру, бо савецкая дзяржава абмежвае выданьні або не дазваляе друкаваць наагул. Правінцыяльныя школьныя бібліятэкі ня ў стане набыць твораў галоўных беларускіх пісьменьнікаў, хіць яны й стаяць у сьпісах рэкамэндаваных да чытаньня твораў. Затое расейскія кніжкі або расейскія пераклады зь беларускае мовы дастаць лёгка. Беларуская Акадэмія Навукаў усе свае навуковыя працы выдае парасейску, не падаючы навет, што некаторыя зь іх — пераклады зь беларускае мовы. Сяньня больш за 80 працэнтаў кніжак і брашураў у БССР друкуецца парасейску.

Вынікам усіх гэтых мерапрыёмстваў — культурнае спусташэньне, у вабставінах якога саветызываныя Беларусы выракаюцца сваіх культурных вартасьцяў. Паводля савецкае статыстыкі, 46% гарадзкога жыхарства БССР гаворыць парасейску. Тымчасам як гарадзкія цэнтры беларускае культуры русыфікуюцца, расейская мова стаецца другою мовай сяла. Культурны супраціў на Беларусі засярэджваецца вакол пары выданьняў, гэткіх як „Літаратура й Мастацтва", або „Маладосьць", вакол хораў, самадзейных гурткоў, селавых клюбаў. Але шмат хто зь інтэлігенцыі пачаў глядзець на беларускі нацыяналізм як на перажытак ці музэйную рэч. Мікалай Вакар, адзін з дасьледнікаў беларускага пытаньня, перадае гэткую сваю гутарку з саветызаваным Беларусам, студэнтам культурнага абмену ў ЗША:

„Для нас, — казаў гэны студэнт, — расейская мова сталася савецкаю моваю, а ня толькі моваю Расейцаў. Гэта сусьветная мова, падобная да ангельскае ці францускае. Праз яе мы станемся ўдзельнікамі ў сусьветнай гісторыі й культуры. Безь яе — мы былі-б напоў-пісьменнаю нацыяй работнікаў і сялянаў, якой, на самай рэчы, і ёсьць бальшыня беларускага народу".

Гэта словы Беларуса, што пайшоў супраць свайго народу. Ён здэнацыяналізаваўшыся ў выніку дзеяньня савецкае асыміляцыйнае праграмы й мэтадаў індактрынацыі. Мы ня маем спосабу даведацца, да якое ступені гэта прадстаўнік беларускае моладзі. Але калі ён наагул тыповы, дык у ім — мера ўдачы савецкага намаганьня ў зьнішчэньні беларускае культуры.

Што мы ў Задзіночаных Штатах можам зрабіць, каб адвярнуць гэты культурны гэнацыд? Саветы праз свае прапагандавыя органы, гэткія як „Голас Радзімы", заклікаюць Беларусаў у замежжы варочацца дамоў. Беларусы-ж у замежжы, маючы ўжо горкае дазнаньне, пэўна-ж, ня сквапныя на гэткія штукі. Але нам трэба актыўна супрацьдзеіць гэтаму савецкаму прапагандаваму наступу. Не зважаючы на памеры й ступень савецкіх удачаў у выкарэньваньні беларускае культуры, мы ня можам паддавацца. Наадварот, мы павінны толькі яшчэ мацней падтрымваць дзейнасьць гэткіх арганізацыяў, як Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне і Згуртаваньне Беларусаў Канады. Бо адно праз супольныя намаганьні можам мы спадзявацца ўратаваць ад зьнішчэньня беларускую культуру.

І вы мусіце ўсьведаміць сабе, што ня можа быць мацнейшага й эфэктыўнейшага падтрыманьня вашых ідэалаў і мэтаў, чымся тое, якое вы самі вырабіце. І я тут заклікаю Вас ды вашых сяброў і сымпатыкаў: ня зьнемаршчвайцеся й не ўпадайце ў апатыю ад міту пра савецкую сілу й савецкія ўплывы. Працуйце не спадзяючыся ад вашага руху больш, чымся вы ахвочыя ўкласьці ў яго. Нічога ня можа спыніць адданасьці праву й справядлівасьці. Але нам трэба трымацца гэтае адданасьці!

БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА У МЭЛЬБУРНЕ

У Мэльбурне (Аўстралія) ўзноў зарганізавалася беларуская нядзельная школа. 2 і 9 жніўня адбыліся зборкі бацькоў і настаўнікаў. На першай зборцы было пастаноўлена адчыніць школу, а на другой — быў выбраны Бацькоўскі камітэт у складзе сп. А. Грушы — старшыні, сп. А. Кукеля — скарбніка й сп. Шнэка — сакратара, былі абмеркаваныя справы гаспадарскія, а настаўнікі сп-ня Э. Яцкевіч, сп. Сідлярэвіч і сп. Нікан падзялілі свае абавязкі.

У Аўстраліі цяпер зіма, дык заняткі ў школе пачаліся 9 жнівеня, якія будуць рэгулярна адбывацца па 3 гадзіны кажнае нядзелі. Настаўнікі ўжо заплянавалі падрыхтаваць дзяцей да ўдзелу ў урачыстым сьвяткаваньні сёлетніх угодкаў Слуцкага Паўстаньня.

Застаецца адно пажадаць настаўнікам, вучням ды іхным бацьком як найлепшых вынікаў у пачатай добрай справе.

М. Н.

ДЭЛЕГАЦЫЯ У ГУБАРНАТАРА НЬЮ ДЖЭРЗІ



Зь ініцыятывы старшыні Арганізацыі Паняволеных Народаў у Нью Джэрзі сп. Д. Марчышына дэлегацыі паасобных нацыянальнасьцяў, што прадстаўлялі: Альбанію, Азэрбайджан, Армэнію, Баўгарыю, Беларусь, Казакію, Эстонію, Грузію, Вугоршчыну, Латвію, Летуву, Паўночны Каўказ, Польшчу, Румынію, Сэрбію, Славаччыну й Украіну, наведалі 8 ліпеня сёлета Губарнатара штату Нью Джэрзі Вільяма Т. Кагіля з нагоды Тыдня Паняволеных Народаў.

Губарнатар вельмі прыхільна прыняў дэлегацыю і ў ейнай прысутнасьці падпісаў праклямацыю, якой абвяшчаўся тыдзень ад 12 да 18 ліпеня Тыднем Паняволеных Народаў у штаце Нью Джэрзі.

Беларусаў рэпрэзэнтавалі сп-ня А. Войтанка й сп.сп. Я. Азарка й Т. Супрун, якіх бачым на вышэй зьмешчаным фотаздымку у самай сярэдзіне з-заду за Губарнатарам.

СПРАСТАВАНЬНЕ

Япархіяльная Ўправа Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на Амэрыку й Канаду, на сваім пашыраным паседжаньні 5 верасьня 1970 году, азнаёміўшыся зь неадказваючымі праўдзе весткамі, пададзенымі ў газэце „Беларускі Голас", у № 185 за жнівень сёлета, у справе сьмерці й паховінаў сьв. пам. Уладыкі Васіля, у імя праўды асьвятчае:

1. Няпраўдаю ёсьць, што Ўладыка Васіль сам пакончыў сваё жыцьцё, бо прычынаю сьмерці быў атак сэрца, пра што сьветчыць акт, сьпісаны лекарскаю камісіяй пры Гарадзкой Управе й лекарскія даводы дактароў, у якіх Уладыка лячыўся.

2. Выдумкаю й маною ёсьць, што паніхіды па сьв. пам. Уладыку Васілю адбываліся каля пустое труны, а цела было ў труну ўложанае перад вывазам на магільнік, бо ў запраўднасьці труна зь целам была прывезеная пахароннай установай у Катэдральны Сабор у Брукліне ў панядзелак 15 чырвеня, дзе знаходзілася аж да часу паховінаў 17 чырвеня, аб чым сьветчыць дырэкцыя пахароннага бюра, што выконвала бальзамаваньне цела.

3. Абрады паховінаў былі выкананыя згодна чыну паховінаў Архіярэяў і Сьвятароў у васысьце двух Япіскапаў, двух Сьвятароў і трох дыяканаў.

4. Манлівымі й ілжывымі ёсьць пададзеныя ў „Беларускім Голасе" весткі аб нейкай раней выкапанай у цэнтры магільніка яме й аб забароне Ўладыкам Андрэем там хаваць і вызначэньні нейкага месца на ўзбоччу магільніка, што ў запраўднасьці таксама зьяўляецца злачыннай выдумкай, бо-ж магільнік у Саўт Рывэры зьяўляецца ўласнасьцяй парахвіі Жыровіцкае Божае Маці ў Гайлэнд Парку, і выбар месца належыць да Парахвіяльнае Рады.

Прадыскуаваўшы ўсебакова пададзеныя ў „Беларускім Голасе" пашквільныя, немаральныя, шкодныя для беларускага грамадзтва весткі, Япархіяльная Ўправа пастанавіла за пасярэдніцтвам прэсы паінфармаваць беларускае грамадзтва аб запраўдных фактах сьмерці й паховінаў, каб самі чытачы вынесьлі свой прысуд аб пашквільнай дзейнасьці рэдактара „Беларускага Голасу", і пацягнуць яго да судовай адказнасьці.

5 верасьня 1970. М. Гумен
Сакратар Япархіяльнай Управы БАПЦ

НОВАЯ КРУЖЭЛКА КЛЮБУ „ПАГОНЯ"

Гэтымі тыднямі выйдзе новая патэфонная кружэлка зь беларускімі танцамі пры ўдзеле гэтым разам выдатнага тэнара Сяргея Шульгі і ў выкананьні ведамай Ашаўскай аркестры „Мэлёдыя" пад кіраўніцтвам Балеслава Лішчонка.

Гэта будзе з чаргі 3-яя кружэлка згаданай аркестры, якія выпускае й фінансуе Беларускі Выдавецка-Мастацкі Клюб „Пагоня". Новая кружэлка вельмі цікавая сваім рэпэртуарам ды вызначаецца добрым выкананьнем і найграньнем.

ЧАМУ ЛЮБЧА ЁСЬЦЬ ЛЮБЧА

Пасярод зямлі аблонь,
Па аблоні ходзяць рэкі,
Усё мінула, што было,
Усё прайшло навекі.

Уладзімер Хадыка

У сівой далячыні стагодзьдзяў зьнікае нараджэньне гэтага маляўнічага паселішча, што мае такі-ж самы прыгожы назоў. Цяпер Налібоцкая пушча адсунулася ад Нёману да свайго спавітага паданьнямі сіняга дыяманту — возера Кромань, а тады з абодвух бакоў зялёнай аправай атуляла яна родную раку. Тут у часе кароткага адпачынку паміж баявымі паходамі паляваў на тураў і зубраў заснавальнік Вялікага Княства Літоўскага суворы Міндоўг і, як пялі пазьней дудары, забыўся на свой меч, пабачыўшы аднойчы ля пераправы красуню Марту. Яна сталася ягонай жонкай і падарыла яму сына Вайшэлка, а тады бязыменнаму перад тым паселішчу, скуль паходзіла Марта, удзячны Міндоўг надаў ад сэрца адпаведнае ймя — Любча.

У 1251 годзе ў Любчы, у першым на Літве касьцёле, Міндоўг прыняў хрысьціянства, дзеля чаго адмыслова прыбыў сюды з Польшчы дамініканін япіскап Віт, але-ж неўзабаве ён вяртаецца да язычтва, праганяючы з краіны ксяндзоў. Калі потым Вайшэлак станецца праваслаўным манахам, дык занадта яшчэ далёкім ад хрысьціянства быў ягоны бацька Міндоўг, пры ўспаміне аб якім адразу прыгадваецца „Малітва Пяруну" Канстанціна Язавітава, што распачынаецца зваротам нашых продкаў:

Пярун наш Бацька,
Ясны Божа Грому!
Даруй нам!
Жрацы Хрыста нас ашукалі!
— і канчаецца іхняй просьбай —
Памажы, Пярун, нам,
Бог наш Грозны, Мілы,
Цяць галовы гадам
Ад чванлівых плеч.

Паводля летапісу, яшчэ ў 1281 годзе зьяўляецца ў Любчы драўляны замак, што нечакана пацьвердзіў і знойдзены на замчышчы бронзавы флюгер, на якім была тая-ж дата. У 1499 г. вялікі князь Літоўскі Александар Казіміравіч падараваў Любчу свайму сакратару Тодару Храбтовічу, які прадаў яе Віленскаму ваяводзе Альбэрту Гольштаду, ад таго яна пазьней пераходзіць да магната Яна Кішкі. У пачатку 17 стагодзьдзя тут ужо гаспадарыць Радзівілы. Прыпушчаюць, што распачаў будаўніцтва тутэйшага каменнага замку яшчэ Ян Кішка, але скончыў Багуслаў Радзівіл, што атрымаў яго ў пасагу за сваёй жонкай Ганнай. З канца гэтага стагодзьдзя пачынаецца заняпад Любчы, якую яшчэ ў 1535 годзе спрабаваў зьнішчыць Іван Грозны, а ў 1662-м зусім спустошыў цар Аляксей Міхайлавіч. І нарэшце ў вапошнія два стагодзьдзі тут пануюць розныя Вітгэнтэйны ды Набокавы.

Колішні ажыўлены горад ператварыўся ў сьціплае мястэчка. І дарма што ў 1905 годзе Любча налічвала 870 жыхароў, а цяпер іх 4 тысячы, але-ж яшчэ ў канцы 16 стагодзьдзя кароль Жыгімонт Трэйці зусім ня выпадкова дараваў ёй Магдэбурскае права і гэрб, дзе на блакітным полі была сярэбраная падкова канцамі ўніз і ўнутры яе два ласі, а наверсе й пры канцох залатыя крыжы. Навет раён перанесьлі цяпер зь Любчы да Карэлічаў і таму закрылася мясцовая газэта, а між тым яшчэ абаронца Сымона Буднага Ян Кішка заснаваў тут друкарню, дзе паміж іншымі кніжкамі з адзнакай на латыні „Любча на Нёмане", выдалі свае агульнаэўрапейскага значаньня палемічныя працы Пётра й Ян Кміты. І хай сабе тутэйшую школу скончылі па вайне больш за тысячу юнакоў і дзяўчат, але-ж летась яна абыходзіла сваё 550-годзьдзе, бо заснаваная паводля пастановы таго самага гістарычнага Сабору Япіскапаў ў 1416 годзе ў Навагрудку, які, адмяжаваўшыся ад Масквы, аднавіў Літоўскую мітраполію. І хоць каля будынку, дзе месьціцца школа, пастаўлены цяпер помнік-бюст партызанцы Людміле Сечка, аднак будынак той пабудаваны яшчэ Радзівіламі.

На самым краю стромкага берагу Нёману, у канцы Замкавай вуліцы, якая, магчыма, зьмяніла цяпер свой назоў, узвышаецца палацова-замкавы ансамбль Радзівілаў. Да малюнку гораду, які датычыць да першай паловы 17 стагодзьдзя, дададзена наступнае тлумачэньне: „З каменьня замак над Нёманам з чатырма вежамі і кажная ўпрыгожана бляшаным купалам. У першай вежы дубовая брама, набітая цьвікамі. Наверсе заля, побач жылы дом крыты гонтай". Гэтая манумэнтальная чатырохпавярховая вежа, складзеная з шэрага дзікага каменю, мае ўнізе выгляд куба, які вышэй пераходзіць у васьміграньнік з байніцамі й пакрытая шатровым дахам із шпілём. Першы паверх вежы заняты тунэлям-праездам, а па вузкіх сходах можна трапіць да вышэйшых зь цікавымі вокнамі рознае вялічыні й формы — і сьпічастымі, і круглымі. Аднак памыляецца Ў. Чантурыя, калі ў сваей манаграфіі „Гісторыя архытэктуры Беларусі" адзначае: „У мінулым толькі праз яе можна было трапіць ува ўнутраны двор". Акрамя гэтае вежавае брамы, была яшчэ брама, што вяла ў парк, праз які ад яе ішла дарога з мастом праз роў да палацу. Яна ўяўляла зь сябе чатыры мураваныя слупы зь зялезнымі дзьвярыма пасярэдзіне і з двумя форткамі па бакох. І ці не разбураная яна з тае прычыны, што яе зьверху ўпрыгожваў гэрб Любчы, які, дарэчы, ня стаўся для яе на будучыню сымбалічным?

З артыкулу Л. Пракопчыка „Любчанскі замак", зьмешчанага ў „Літаратуры і мастацтве" ад 22 леташняга жніўня, мы дазналіся пра рамонт другой вежы замку, што засталася напоўразбуранай яшчэ пасьля Першай сусьветнай вайны, якая дарэшты зруйнавала дзьве іншыя вежы й спаліла палац. Але, нажаль, нічога ня чуваць пра аднаўленьне зьнішчанай брамы з гэрбам, як і пра ахову, калі толькі яны наагул існуюць, старадаўніх цэркваў — Ільлінскай на Замкавай вуліцы, ад якое й тутэйшы кірмаш быў шырака вядомы ў Панямоньні, як Ільлінскі, і недалёкай ад Любчы Падліпкі што атрымала свой ідылічны назоў ад векавой ліпы, каля якое была пабудаваная ў 1694 годзе. Няма весткаў і пра ўвагу да шматвяковага могільніку паміж Любчай і Падліпкай, а між тым, апрача пашаны да дзядоўскіх касьцей, напісы на ягоных абамшэлых надгробках зьяўляюцца каштоўнымі для краязнаўцаў. І нарэшце нам хочацца думаць, што наўсуперак прапановам тых энтузіястых, для якіх гісторыя беларускага народу пачынаецца ад стрэлу „Аўроры", захавае ўсё-ж Любча свой прашчурамі адказаны назоў, а ня набудзе новага — Сечка.

Юрка Віцьбіч

ЗЬ БЕЛАРУСКАГА САВЕЦКАГА ДРУКУ

БЕЛАРУСКІЯ КАЛЕНДАРЫ КАЛІСЬЦІ І ЦЯПЕР

„Беларускі дасьледчык А. Мальдзіс зацікавіўся, калі ўзьніклі першыя беларускія календары. Высьветлілася, што яшчэ ў 1673 годзе ў Слуцкай друкарні быў зроблены заказ на календары ў чацьвёрку фармату — 1.000 экзэмпляраў, календары меншыя — 2.000 экзэмпляраў. Пасьля гэтага ў Беларусі выдавалася шмат розных календароў.

„Мае цікавасьць ‚Акадэмічны каляндар для народных школ правінцый Вялікага Княства Літоўскага на 1787-1788 навучальны год', выдадзены ў Вільні. Ён паведамляе, якія й дзе школы знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі, хто ў іх выкладаў і навет вучыўся". („Настаўніцкая газэта" 5 верасьня, 1970 г.)

**

. . . „Пытаньне аб неабходнасьці выдаць, нарэшце, беларускі каляндар, колькі разоў падымалі, абмяркоўвалі і... забывалі. І я пісаў пра гэта ў выдавецтва „Беларусь". Мне паведамілі адтуль, што для выданьня календара ў нас... няма паліграфічных магчымасьцяў. Не магу паверыць!

Нядаўна ў вёсцы, у аднаго селяніна выпадкова ўбачыў лісток з календара 1913 году выданьня. Польскі. Але карыстацца ім маглі не адны Палякі, бо ён на некалькіх мовах, у тым ліку і на рускай. Дык няўжо ў 1913 годзе паліграфічная база была больш магутная, чым цяпер? Думаецца, што аднаго настольнага перакіднога календара, неяк выдадзенага на беларускай мове, мала для Беларусаў, высокаразьвітай сацыялістычнай культурай якіх сёньня ганарыцца ўся краіна". („Літаратура й Мастацтва", 28. 8. 70.).

НА КАМАРОЎСКІМ РЫНКУ Ў МЕНСКУ

„Сам сацыялістычны ўклад нашага ладу дыктуе іншыя ўзаемаадносіны паміж прадаўцом і пакупніком". (Радыё-Менск, 7. IX. 70 г.)

„Нам, жыхаром г. Ляхавічы Берасьцейскае вобласьці часам даводзіцца прадаваць лішкі сельскагаспадарскае вытворчасьці на Камароўскім калгасным рынку. Гэта выглядае так: спачатку на вазох падвозім прадукты да Баранавіцкае шашы, адтуль спадарожным транспартам да Менску. Прыяжджаем у Менск а 11-12 уначы, а часамі й пазьней. Гэтай парой рынак, зразумела, зачынены і мы ў нашыя 60-70 год змушаныя чакаць да сёмай гадзіны раніцы пад брамай. Пад сёмую раніцы тут зьбіраецца шмат аўтамашынаў і людзей з таварам. Перавезьці яго няма чым: машына разгружаецца ля варотаў і ад'яжджае, а мы носім мяшкі на сабе, бо вазкамі ня могуць забясьпечыць усіх. А пасьля трэба выстаяць у доўгай чарзе па вагу.

„Тыя, што ня ведаюць пра гэтую працэдуру, адразу едуць у браму, іх там ня пушчаюць, паўстае затор. А вось падаць да ведама аб тым, які парадак рэалізацыі, якая плата бярэцца за продаж тавараў з машыны, каляскі ці прылаўку, адміністрацыя не здагадалася. Чакаючы раніцы, людзі валяюцца дзе папала...

„Санітарны стан жахлівы. Адпады фруктаў і гароднiны валяюцца па двое сутак не прыбіраныя, усюды восы й мухі. Гарачае вады няма.

„Палівальная машына ня можа прайсьці між прылаўкамі. Лужыны вады трэба разьмятаць венікам, бо на трохгектарнай плошчы Камароўскага рынку ёсьць толькі адна вадасточная адтуліна...

„Гэтак і стаяць рыначныя прылаўкі: вечарам іх змываюць, уначы на іх сьпяць, а ўдзень на іх раскладаюць для продажу дары прыроды, парушаючы гэтым самым элемэнтарныя санітарныя вымогі..."

(М. Багдановіч, Байрашоўскі ды іншя. „Советская Белоруссия", 5. IX. 1970 г.)

ЗОЛАТА ... НА БЕЛАРУСІ

„Здаўна людзі зьвязвалі нараджэньне мэталяў з нараджэньнем гор. Яно й запраўды так. Вось чаму Беларусь з-за раўніннага характару рэльефу да нядаўняга часу лічылася непэрспэктыўнай для пошукаў мэталяў. Так, на паверхні нашае рэспублікі гор запраўды ня відаць, але, аказваецца, яны былі. Іх рэшткі існуюць і цяпер, толькі на значнай глыбіні, пад тоўшчай асадачных парод.

„У пачатку 50-ых гадоў на Беларусі пачалі выяўляць старажытныя, так званыя дакембрыйскія крышталічныя пароды, якія ўтварыліся больш чым мільярд гадоў назад. Былі згадкі аб магчымасьці знаходжаньня руд чорных і каляровых мэталяў у гэтых пародах. Больш канкрэтныя гэтыя сьцьвярджэньні сталіся ў канцы 50-ых гадоў, калі пачаліся сыстэматычныя дасьледваньні фундамэнту, яго складу, мэталяноснасьці і ўзросту. І вось цяпер мы маем вялікі матар'ял аб мэталяноснасьці крышталічнага фундамэнту рэспублікі. У Горадзенскай вобласьці, напрыклад, устаноўленая медная, залатая й рэдкамэтальная руданоснасьць".

(А. ПАП, кандыдат геалёга-мінэралягічных навукаў. „ЗЬВЯЗДА", 30 жніўня 1970 г.)

СЬНЕГ СПЫНЯЕ АЎТАБУСЫ

„— Цяпер у рэспубліцы звыш 2.600 аўтабусных маршрутаў, на якіх адбываецца падвоз вучняў у школы, — сказаў намесьнік міністра аўтамабільнага транспарту БССР В. Афанасенка.

„... Цяжкасьці, на жаль, яшчэ ёсьць. Усім зразумела, што падвоз вучняў на заняткі і з заняткаў — справа не толькі работнікаў аўтатранспарту. Ня менш павінны быць зацікаўленыя, каб школьнікі наведвалі заняткі ў любую пару году, мясцовыя арганізацыі. А што чакам атрымваецца? Скажам, зімою паявіліся сьнежныя заносы. І вось з-за несваечасовай ачысткі магістраляў калгасамі, саўгасамі й дарожнымі ўстановамі на пэўны адрэзак часу спыняецца рух аўтабусаў. Пакутуюць праз гэта школа й вучні. Заўважу, што абыякава сочаць зімой за станам дарог у Берасьцейскай, Горадзенскай вобласьцях і ўва ўсходніх раёнах Магілеўшчыны".

(„Настаўніцкая газэта", 2 верасьня 1970 г.)

НЕ СТАЕ НАЙБОЛЬШ ЭЛЕМЭНТАРНАГА

„—У гэтым годзе гандлёвыя арганізацыі лепш, чым гэта было раней, забясьпечаныя дзіцячымі таварамі рознага асартымэнту, — сказаў намесьнік міністра гандлю Беларускай ССР таварыш І. Каленьнікаў, — аднак такога асартымэнту, як курткі для хлопчыкаў і дзяўчатак, гумовыя й скураныя боцікі, вучнёўскія ранцы яшчэ не хапае.

„— Вялікі попыт, як ведама, на новую шкільную форму, але, на жаль, яна ёсьць яшчэ далёка не для ўсіх узростаў. А справа ў тым, што прамысловыя прадпрыемствы недастаткова выпрацоўваюць і дастаўляюць на продаж гэтыя тавары". („Настаўніцкая газэта", 2 верасьня, 1970 г.)

З ПАДАРОЖЖА ВАКОЛ СЬВЕТУ

2. АЎСТРАЛІЯ — АЗІЯ — ЭЎРОПА

(Працяг, пачатак у № 160)

Падарожжа самалётам у сяньняшнія дні вельмі выгоднае. Ня дзіва, што лік пасажыраў, як і танаж перавожаных самалётамі тавараў, вельмі хутка расьце й пачынае ў сваю карысьць канкураваць із зямным і марскім транспартам. Разбудоўваюцца старыя, будуюцца вялізарныя новыя лётнішчы. Расьце й лік лётніцкіх ліній, якія густою сеткаю зьвязалі цэлы сьвет. Самалёты будуюцца штораз большыя, выгаднейшыя й хутчэйшыя, таму й танейшыя ў карыстаньні імі, а дзеля гэтага й больш даступныя й для небагатых людзей. Калі кошт палёту ўжываным самалётам аднаго пасажыра ацэньваецца 2,7 цэнта за мілю, то ўжо навейшымі самалётамі гэты кошт абніжаецца да 2,3 цэнта за мілю, што складае кошт паветранага падарожжа вакол сьвету (каля 25 тысячаў міляў) каля 575 даляраў. Я заплаціў 1,260 даляраў. Кошт групавых падарожжаў, якія становяцца штораз больш папулярныя, абніжаецца да 60% нармальнае цаны. Але й на гэтым лётніцкія фірмы яшчэ добра зарабляюць, бо выкарыстоўваюцца ўсе месцы ў самалёце.

Выляцеў я з Мэльбурну, як падавалася ў папярэднім артыкуле, 7 ліпеня ўвечары. Праз гадзінку прызямліўся ў Сыднэі, дзе перасеў у другі, крыху большы самалёт. Пасажыраў было ня шмат, дык мог выгадна „разлажыцца" аж на трох крэслах ды пазволіць сабе „адпачыць". Нэрвы за апошні час былі туга нацягнутыя. Гэтулькі-ж перажылося! Думка пра тое, ці ўдасца пабываць на Бацькаўшчыне, пабачыць сваіх, засланяла ўсё іншае. Суседзтва цёмных і жоўтых (азіятаў), якіх у самалёце была бальшыня, прыпаміналa, куды ляту.

Перад Дарвінам „далікатна" нас разбудзілі. Было яшчэ шэра, калі мы выйшлі із самалёту прайсьціся. Было цёпла. Адчуваўся тропік. Хутка паляцелі далей. Найчасьцей ляцелі высока сярод хмараў або й над імі. Часамі было чыстае неба й з прыемнасьцяй можна было любавацца морам. Калі былі ля Філіпінаў, самалёт крыху зьніжаўся, магчыма спэцыяльна, і мы маглі даўжэйшы час аглядаць у праменьнях раньняга сонца цудоўныя краявіды. Сэрца мацней білася ад радасьці, што сьвет, не зважаючы на ўсё, гэткі прыгожы.

Зараз пасьля абеду прызямліліся на лётнішчы амаль у самым Гонг-Конгу. Хутка палагодзілі фармальнасьці, і я ўжо ў таксі еду да замоўленага гатэлю. Разглядаюся. На вуліцах поўна людзей, самакатаў, самаходаў, аўтобусаў — вялікіх чырвоных, як у Лёндане. Дык нешта знаёмае й ня зусім новае. Так, тут Усход спатыкаўся із Захадам.

У гатэлі хуценька пераадзяюся й распытваю, як найлепш пазнаць горад. Адразу запісваюся на экскурсію самаходам. А так як перад ёю маю яшчэ паўтары гадзіны часу, выбягаю з апаратам у горад. Новыя й старыя вуліцы, новыя шматпавярховыя дамы зь вялікімі магазынамі, заваленымі таварамі, і старыя колькіпавярховыя дамы, даволі падняшчаныя, каляровыя, з абвесткамі-рэклямамі праз вуліцу ў кітайскай і ангельскай мовах, з таварамі й майстэрнямі амаль на вуліцы. Скрозь заахвочваюць купіць. Хутка пераканаўся, як моцна тут ашукваюць, як трэба пільнавацца, каб утрая ня пераплаціць.

Вяртаюся ў гатэль і за колькі хвілін ад'яжджаю спэцыяльным самаходам на экскурсію па Гонг-Конгу. Не шкадую пяць даляраў. Была цікавая. Пабачыў старыя й новыя часткі гораду, раськінутага на абтоках. Былі высока ў горах з цудоўным выглядам на горад і мора. Былі ў Кітайскім музэі, што прыпамінае кітайскае мінулае. Пабачыў кітайскі „гарадок на вадзе", дзе калькінаццаць тысячаў людзей жыве ў лодках спосабам, які магчыма не зьмяніўся за тысячу год. Бачыў кітайскіх уцекачоў, што тысячамі ўцякаюць із свайго „раю" ды шукаюць тут прыпынку, прабуючы неяк уладзіцца ў гэтай вольнай пад ангельскім пратэктаратам і шчасьлівай калёніі.

Назаўтрае паўдня сам бегаў па горадзе, яшчэ аглядаў, прыслухоўваўся, рабіў пакупкі (Гонг-Конг — вольны горад, вольны ад цла, таму параўнальна таньня, асабліва на японскія хвабрыкаты). Падвечар на японскім самалёце паляцеў далей — да сталіцы Тайлянду Банкок. Нязвычайна цікавы горад: рэчка, ваколіцы, людзі, жыцьцё. Расьпісвацца, аднак, аб ім з увагі на абмежанасьць месца, не магу, а толькі, коратка ўспомню і аб Нью Дэлі, дзе быў 10 і 11 ліпеня, і аб Тэгеране, дзе затрымаўся з 11 да 13 ліпеня.

Тры гэтыя сталіцы — тыповыя для Паўдзённай Азіі, тым цікавыя для нас, што там найлепш можна пабачыць вялікія кантрасты Азіі, найвялікшага й найстарэйшага культураю кантынэнту, які пачынае будзіцца да новага жыцьця, вызваляцца спад белай залежнасьці ды будаваць сваё новае апрычонае жыцьцё. Гэта гарады — кажны па свойму — поўныя экзотыкі іншага для нас сьвету, дзе супэрбагацьце ўсьвятынях і палацах пануючых і дзе да сяньня побач галіты мільёнаў, якія, хаця йшчэ зьвязаныя рознымі „вузламі традыцый", пачынаюць дамагацца й прабуюць „людзьмі стацца".

У гэтых гарадох, асабліва ў двух апошніх бачыў шмат расейскіх „турыстаў". Седзячы ў гатэлі ці ў кавярні побач, чуў шмат цікавых гутарак, зусім шчырых, бо не спадзяваліся, каб нехта мог іх там разумець. У Банкоку было шмат Амэрыканцаў.

У Тэгеране меў цікавую прыгоду, якая чуць ня скончылася для мяне трагічна. Раніцай 13 ліпеня, едучы ў таксі з гатэлю на лётнішча ды вымінаючы калёнку цяжкіх самаходаў, шафёр „насочыў" на людзей на ходніку. Катастрофа. Шафёра затрымаў натоўп. Я за свае валізкі й да другога таксі, якое ў гэты мамэнт пад'ехала. Але й гэтым далёка не заехаў. Хутка „навалiла" кола і ўзноў чуць не катастрофа. Трэйцім ажно таксі даехаў у апошні мамэнт да аэрадрому й апошнім убег у самалёт, якім адляцеў да Бэйруту. Памятаю добра гэты чысты й прыгожы „францускі" горад яшчэ з 1942-43 году, калі быў у Другім Корпусе Андэрса. Тады навет абраў яго за горад, у якім эвэнтуальна хацеў-бы жыць, калі-б астаўся на эміграцыі. Сяньня ўжо зжыўся із сваім Мэльбурнам. Але, пабачыўшы Бэйрут, усьцешыўся.

З Бэйруту паляцеў цудоўнай дарогай у цудоўную пагоду да Атэнаў, сталіцы Грэцыі. Гэтулькі аб ёй раней думалася! Урэшце — пабачыў, нацешыўся! Прабыў тут два незабыўныя дні. У памяці ажыла вялікая мінуўшчына Гэльляды—Грэцыі.

Але Атэны — гэта ўжо Эўропа. Пахла Эўропай. Эўропаў пахла і ў Дуброўніку, югаслаўянскім старым горадзе й порце над Адрыятыкам, і ў Белградзе, дзе раней, 4 верасьня 1939 году, вяртаючыся з Францыі дамоў, затрымаўся быў на адзін дзень. Белград мне падабаўся. А таму што была цудоўная ліпенская пагода, было шмат людзей-турыстаў, а мой гатэль быў добры й танны, дый ежа добрая, хадзіў па вуліцах-парках, быў над Дунаем, у музэі (усюды стараўся быць прынамся ў вадным) і цешыўся, што жыву. Але ў Белградзе меў адзін даволі прыкры выпадак. Як скрозь, гэтак і тут, рабіў фотаздымкі. У вадным месцы, сходзячы пад мост, пабачыў, здаецца, цыганку з дзіцем на руцэ. Выглядала арыгінальна, але вельмі бедна. „Пстрыкнуў" і яе. У гэты мамэнт падбеглі маладыя Югаславы й абурэньнем запыталі, чаму зрабіў здымку. Паказаць беднату Югаславіі? Сьмяяцца? Быў змушаны доўга тлумачыцца.

Зь Белграду паляцеў да Будапэшту. Затрымаўся ў 18-ці павярховым мадэрным гатэлі на самым верху (таней), але з прыгожым відам на горад. У Будапэшце ўжо было інакш. Навет на лётнішчы, дзе чакаў вельмі доўга на таксі. (Прыехаў да гатэлю з амэрыканскімі Жыдамі, што вярталіся з падарожжа па СССР. Потым зь імі езьдзіў па горадзе). Старая частка Будапэшту — гістарычная — надзвычай прыгожая. Але „жыльлёвыя" вуліцы й дамы, трохі далей ад цэнтру, выглядалі вельмі шэра й аж прасіліся рамонту, направы, маляваньня.

У Будапэшце было ціха й спакойна. Руху ані радасьці ня бачыў. У найпрыгажэйшым і найвышэйшым месцы стаіць помнік савецкім воінам. Турыстыя з увагаю аглядаюць яго. Мясцовыя-ж, калі й бываюць там, дык адно каб паўзірацца на цудоўны адгэтуль від на горад і Дунай. Вечарам, калі „лазіў" сам каля слаўнага Парляманту над Дунаем, падыйшла да мяне нечакана даволі маладая Полька, якая прыехала сюды ў госьці да цёткі, каб пабачыць горад, а перадусім парабіць нейкія пакупкі, бо мелася быць тут таней, чымся ў Польшчы. Усьцешылася, што зразумеў яе. Крыху пагутарылі. Сказала мне, што калі прыехала ў Будапэшт і шукала цётку, — а зьвярталася парасейску, бо толькі гэтую „замежную" мову ведала, — тутэйшыя не хацелі зь ёю навет гаварыць.

17 ліпеня позна вечарам прыляцеў я да Варшавы. Спаткалі мяне сваякі. Спаткалі з прыемнай весткаю, што афіцыйнае запрашэньне для мяне наведаць матку на Беларусі ўжо ў дарозе з Ваўкавыска ў Варшаву. Дык ехаў да сваякоў з падвойнай радасьцяй: што пасьля 10-ёх дзён гэтак багатых перажываньнямі крыху адпачну ў Варшаве, ды што ёсьць надзея быць на Бацькаўшчыне й пабачыцца з маці.

М. Н.

(Далей будзе)

ТЫДЗЕНЬ ПАНЯВОЛЕНЫХ НАРОДАЎ У ЛЁС АНДЖЭЛЕСЕ

Сёлетняе сьвяткаваньне Тыдня Паняволеных Народаў у Лёс Анджэлесе было асабліва ўрачыстым, разнаякім і цікавым. Вялікую й багату праграму сьвяткаваньня праводзіла міжнацыянальная арганізацыя Амэрыканцы за Свабоду Паняволеных Народаў. Дзесяткі тысячаў надрукаваных праграмы былі распаўсюджаныя сябрамі арганізацыяў паасобных нацыянальнасьцяў: Арменіі, Баўгарыі, Беларусі, Харвацыі, Кубы, Чэхаславаччыны, Эстоніі, Вугоршчыны, Латвіі, Летувы, Польшчы, Румыніі і Украіны.

У сьвяткаваньні асабіста прыняў удзел старшыня Фэдэральнага Камітэту Паняволеных Народаў праф. Леў Дабранскі. 10 ліпеня вечарам у Галівудзе ў гатэлі „Рузвэльт" праф. Л. Дабранскі меў даклад для сяброў арганізацыі Амэрыканцы за Свабоду Паняволеных Народаў, ёнжа выступаў у аддзеле „Навіны" на 5-ым канале тэлевізіі.

Галоўная частка праграмы адбылася ў суботу 11 ліпеня перад будынкам Гарадзкой Управы гораду Лёс Анджэлес. Вялікі ўрачысты сход пад адкрытым небам выглядаў вельмі каляровым. На трыбуне сядзела шмат ганаровых гасьцей, было шмат нацыянальных сьцягоў і транспарэнтаў. Кіраваў праграмай ведамы камэнтатар 5-га каналу тэлевізіі Робэрт Дорнан. Сход пачаўся й закончыўся малітвай. Вельмі прыгожую прывітальную прамову сказаў бурмістр гораду Лёс Анджэлес Сэм Ёрты. Былі прачытаныя й перададзеныя арганізатарам урачыстасьці адпаведныя пракламацыі ад губэрнатара Каліфорніі, ад Мэра гораду, Гарадзкой і паветавых радаў. Вялікую прамову сказаў праф. Л. Дабранскі. Пасьля яго прамаўляў харвацкі прадстаўнік д-р Антон Бутковіч. Сярод ганаровых гасьцей на трыбуне знаходзіліся й беларускі прадстаўнік, а перад трыбунай паміж сьцягоў розных нацыянальнасьцяў павіваў і беларускі нацыянальны сьцяг. Беларускія дзяўчаткі ў народных вопратках раздавалі праграмы ўдзельнікам сходу.

Пасьля сходу адбыўся супольны абед у гатэлі „Александрыя", на якім Беларусаў рэпрэзэнтавалі прадстаўнікі БККА і БАЗА. Яны-ж разам зь іншымі прадстаўнікамі, зрабілі экскурсію ў Індэпэндэнс Гол у Кнотс Бэры Фарм. Экскурсія гэтая прынесла ейным удзельнікам вялікае задавальненьне, дзе яны змаглі пазнаёміцца зь гісторыяй паўстаньня пачаткаў амэрыканскай незалежнасьці.

13 ліпеня адбылося спатканьне Камітэту арганізацыі Амэрыканцы за Свабоду Паняволеных Народаў з Гарадзкой Радай. 18 ліпеня адбыўся парад да помніка Вугорскім Змагаром за свабоду ў парку Мэк Артура. Нядзеля 19 ліпеня была прызначаная для Божых Службаў за паняволеныя народы. Беларусы мелі сваю Божую Службу ў украінскай каталіцкай царкве, якую адслужыў у беларускай мове а. Праньціш Чарняўскі. У панядзелак 20 ліпеня адбылося ўрачыстае адчыненьне міжнацыянальнай выстаўкі ў Сіты Гол, якая працягвалася да пятніцы вечарам таго самага тыдня. Беларускі аддзел выстаўкі, хоць наагул сьціплы, але быў даволі зьмястоўны.

Завяршэньнем усіх урачыстасьцяў быў супольны пачастунак у прыватным доме сп-ва Рыдзэўскіх у Студыё Сіты. Ежа была прыгатаваная кажнай нацыянальнасьцяй. З усіх частак сьвяткаваньня было зроблена шмат памятных фатаздымкаў.

Н.

Чытайце, выпісвайце, пашырайце газэту Беларусаў у Вольным Сьвеце „БЕЛАРУС"

ЮБІЛЕЙНАЯ УРАЧЫСТАСЬЦЬ У ЧЫКАГА



Кардынал Коды высьвячае будынкі беларускага культурна-рэлігійнага асяродку ў Чыкага

13 верасьня сёлета Беларускі культурна-рэлігійны асяродак у Чыкага, дзе існуе Беларуская Царква Хрыста Збаўцы, перажыў вялікае сьвята — 15 год свайго існаваньня. Гэта было ня толькі царкоўнае сьвята, але магутная маніфэстацыя Беларусаў і беларускасьці перад сотнямі прадстаўнікоў як амэрыканскага грамадзтва Чыкага, гэтак і розных нацыянальных групаў. Урачыстасьць ушанавалі сваёй прысутнасьцяй Арцыбіскуп Чыкаскай мітраполіі кардынал Коды із сваёй сьвітай і беларускі Біскуп — Апостальскі візытатар для Беларусаў каталікоў Часлаў Сіповіч у асысьце беларускага духавенства. Было шмат духавенства як законнага, гэтак і сьвецкага розных нацыянальнасьцяў з Чыкага й аколіцаў, прадстаўнікоў ад навуковых і культурных установаў, прэсы, радыя, тэлевізіі. Была й ганаровая гвардыя Рыцараў Калюмба ў сваіх традыцыйных каляровых строях із шпадамі. Наагул у царкоўнай урачыстасьці прымала ўдзел каля 500 чалавек.

Да ўрачыстасьці цяжка папрацавалі сьвятар Беларускай Царквы Хрыста Збаўцы а. Уладзімер Тарасэвіч, а. Янка Тарасэвіч, а. Я. Сыраў і вялікі штаб супрацоўнікаў. Будынак асяродку быў павялічаны дабудоўкай, адрамантаваная ды пашыраная зборная заля, упарадкаваныя ходнікі вакол будынку, паложаныя новыя траўнікі. А колькі трэба было палажыць працы, каб наладзіць самое сьвяткаваньне ды прапаганду беларускага асяродку й беларускасьці! Але затое бліскучы вынік прынёс асалоду.

Урачыстасьць адмыслова была наладжаная ў нядзелю 13 верасьня ад 4-ае гадзіны папаўдні, коб магчы згуртаваць як найбольш людзей і духавенства ў беларускім асяродку. Кардынал Коды казаў прачытаць пастырскі ліст па ўсіх каталіцкіх цэрквах перад поўднем, што ад гадз. 4-ае будзе адбывацца нашая ўрачыстасьць зь ягоным ды Біскупа Ч. Сіповіча ўдзелам. Адначасна ён заклікаў вернікаў у меру магчымасьці наведаць Беларускую Царкву.

А 4-ай гадзіне папаўдні пачалася рэлігійная частка ўрачыстасьці. Перш адбылася ўрачыстая працэсія вакол будынку царквы й асяродку, у часе якой Кардынал Коды пасьвяціў дабудоўкі й набытыя будынкі. Тады адбылася пантыфікальная літургія, якую адправіў у асысьце беларускага духавенства Біскуп Ч. Сіповіч. Ён-жа сказаў казань паангельску й пабеларуску. Прыгожа пяяў царкоўны хор пад кіраўніцтвам а. Я. Сырава. У інтэрвалах прафэсійны квартэт выканаў „Дастойна ёсьць", „Хэрубімскую", „Гімн Багародзіцы", „Войча наш" і колькі іншых песьняў.

У канцы літургіі прамаўляў Кардынал Коды, выказваючы сваю радасьць з побыту сярод Беларусаў, хвалячы вялікую актыўнасьць беларускага духавенства з а. Уладзімерам Тарасэвічам на чале ў эўкумэнічным руху ды жадаў беларускаму народу здабыць свабоду ды прадаўжаць слаўную дзейнасьць дзеля задзіночаньня ўсяго хрысьціянства. Літургія закончылася кардынальскім багаслаўленствам пад напевы „Многія леты".

Адразу пасьля літургіі ў рэпрэзэнтацыйнай залі „Гардэн манор" адбыўся банкет у прысутнасьці Кардынала Коды, Біскупа Ч. Сіповіча, беларускага й іншага духавенства, прадстаўнікоў ад розных арганізацыяў і ўстановаў, пархвіянаў Беларускае Царквы й артыстых. З прамовамі выступалі шмат якія асобы: ад Амэрыканцаў Франк Зазолё, ад Беларусаў В. Пануцэвіч, ад беларускага духавенства а.а. Янка й Уладзімер Тарасэвічы. Прамаўлялі Кардынал Коды, Біскуп Ч. Сіповіч, прадстаўнік ад Бэнэдыктынскага манастыра й іншыя. Ува ўсіх прамовах гучаў адзіны матыў: радасьць зь вялізарнай беларускай маніфэстацыі (на банкеце было звыш 300 асобаў) ды пытаньне супрацоўніцтва Беларусаў з усімі нацыямі дзеля дасягненьня вялікай ідэі: свабоды й адзінства чалавецтва.

У мастацкай частцы выступалі салісткі Надзея Градэ-Куліковіч і Вера Рамук. Танцавалі дзеці й дзяўчаты зь Беларускай арганізацыі моладзі пад кіраўніцтвам Веры Рамук. Акампаньявалі: Ст. Боцек і а. Я. Сыраў. Солё на піяніне іграў студэнт Гэнрык Янчэўскі. Уся ўрачыстасьць закончылася а 10-й гадзіне вечара.

У часе банкету былі ўручаныя падарункі Кардыналу Коды й Біскупу Ч. Сіповічу. Кардынал Коды атрымаў дзьве іконы зь беларускімі ручнікамі, Біскуп Ч. Сіповіч — настольны пісьменны прыбор з адмысловым напісам „У дзесятыя ўгодкі біскупства" ды таксама беларускі ручнік. Падарункі Кардыналу Коды былі: адна ікона ад парахвіянаў Беларускай Царквы, другая — ад беларускага духавенства.

В. Карасэвіч

НІЛ ГІЛЕВІЧ

ЭЛЕГІІ НЯЭЛЕГІЧНЫХ ДЗЕН

⁂

Углядайся, мой сыне, пільней углядайся
У сьвятыя абрысы бацькоўскай зямлі.
На чужыя спакусы душой не паддайся,
Каб нашчадкі мяне за свой лёс не клялі.

Каб ня ўспомніла горкім дакорам краіна:
„І чаго ён быў варт, і нашто было жыць:
Нават сына свайго, нават роднага сына
Не ўразуміў, чым трэба ў жыцьці даражыць!..."

⁂

Тут ня хочацца ні гаварыць, ні пець —
Нібы к вечнасьці прыйшоў у госьці.
Можа, гэта той курган-канец,
Дзе ляжаць паэтаў даўніх косьці.

Каб жыцьцё ў пустую не пралахаць,
Кожны мусіць нейкі храм свой мець,
Дзе ня хочацца ні гаварыць, ні пець —
Толькі моўчкі, безгалоса плакаць.

⁂

„Падыміся над бядой і болем,
Калі ты ня кволы чалавек..."
Я — ня волат, і я бываю кволым,
Часам сьлёзы бліснуць спад павек.

Над сваёй бядой, сваёй загубай
Я ўздымуся... Ды ня дай ты Бог,
Каб над болем Бацькаўшчыны любай
Я падняцца калі-небудзь мог!

⁂

Ісьціна, адвечная, як сьвет:
Шчасьце ходзіць толькі ў пары з горам.
За надзеяй — боль зьняверу ўсьлед,
За пашанай — прыніжэньня сорам.

За сьвятлом знаходкі — горыч страты,
За агнём любві — разлукі сьнег.
За абдымкамі — падножка здрады...
Ісьціна, адвечная, як сьвет.

⁂

Бястурботным і неазадачаным,
На пачатку дня, прад ясным поўднем,
Цешачыся дробязнымі ўдачамі,
Лятуценіў я аб векапомным.

І ў даўгу застаўся неаплатным,
І прад вечарам недарастрачаным —
Як паверу я, што стану раптам
Бястурботным і неазадачаным?

⁂

Цераз зарасьнік інею ў ранішнім лесе
Прабіраецца сонца — ціхонечка так,
Затаіўшы дыханьне: хаця-б не атрэсьці
Гэты цуд, што стварыў найвялікшы мастак.

І ўсё-ж нейкую нітачку дзесь зачапіла:
Скалыхнулася голка — пыл срэбны курыць...
Ну і ну! Назат дотыку промня хапіла,
Каб, парушыўшы чары, красу разбурыць!

⁂

Як чараўніца на нябачных кроснах,
Ноч тчэ над лесам цёмны полаг свой.
Во — чуцен шоргат панажоў марозных,
Во — зарупе прастуджана навой.

У край маленства памяць адбягае.
І тчэ і тчэ старую казку ноч,
І ў мутных хмарках месячык мільгае:
Як паміж ніцяў срэбраны чаўнок.

⁂

Гукі сяла, што паволі ўкладаецца спаць:
Гоман, і воклічы, і вуркатня матацыкля,
Бразганьне вядзёр, і нейкага румзалы плач,
Галас сабачы, — ўсё так знаёма і звыкла.

Тут, дзе стаю на пагорку, так добра чуваць,
Як уздымаюцца, падаюць, зноў узьлятаюць
І не ў даліне, а ў сэрцы маім заміраюць —
Гукі сяла, што паволі ўкладаецца спаць.

⁂

Як сумна-тужліва зязюля кукуе ў бары,
На позьнім зьмярканьні, насупраць мядункавай ночы!
Адкуль гэта жальба — у розгар маёвай пары?
Адкуль гэты смутак — такі няпрытворна сірочы?

Вячэрайце ў хаце, а я пастаю на двары.
Па мне ня трубіцеся — піце, гуляйце шчасьліва.
Павінен-жа нехта паслухаць, як сумна-тужліва
Зязюля кукуе на позьнім зьмярканьні ў бары.

⁂

Тут, між гэтых пагоркаў, у гэтых барох і дубровах,
Каля гэтых азёраў і рэк, каля гэтых крыніц,
Узышла і ўзрасла на вякі наша родная мова —
І ніякай інакшай яе немагчыма ўявіць.

Кожным гукам і словам — па каліўцу — тут прарастала
Разам з кожнай травінкай і зёлкай — найменьнямі іх.
Што-ж за дзіва, што нашай душой няўміручаю стала?
Мы-ж і самі ўзышлі і ўзрасьлі тут з глыбінь векавых!

⁂

Цішы сьпякотнай ня веру.
Знаю, што тоіцца ў ёй.
Можа з малога павеву
Бура ўзьляцець над зямлёй.

Грымне — начыста зламлюся,
Грымне — начыста зламлюся,
Грохну — як дрэва на дол.
Думаеш: буры баюся?
Цішы, напятай вакол.

⁂

Пашкадуем, і моцна яшчэ пашкадуем,
Як да розуму прыйдзем (а прыйдзем, відаць!),
Што, пра будучнасьць марачы, гэтак бяздумна
Завіхаліся памяць сваю абкрадаць.

Што магілы дзядоў руйнавалі дашчэнту
І ня бачылі ў гэтым вялікай бяды,
А тым часам з пашанай на ўсіх кантынэнтах
Разглядалі гісторыі нейчай сьляды.

Што з далёкіх вандровак прывозячы здымкі —
Піраміды зь ільвамі ці брамы з арлом —
Мы свае старажытныя цуды-будынкі —
Творчы гэній народу — пускалі на злом.

Ні таўсьцейшаю лустай, ні большай капейкай
Апраўдаць гэту дзікасьць ня зможам павек,
Бо як правіла ў кнізе напісана нейкай:
Не адным толькі хлебам жыве чалавек.

(„Маладосьць", № 6, 1970).

Ніл Гілевіч — адзін з найвыдатнейшых сяньня беларускіх паэтаў — нарадзіўся ў 1931 годзе ў вёсцы Слабада на Лагойшчыне. Скончыў Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт у Менску й працуе дацэнтам на катэдры беларускай літаратуры гэтага ўнівэрсытэту. Выдаў кнігі паэзіі: „Песьня ў дарогу", „Неспакой", „Прадвесьне ідзе па зямлі", „Бальшак", „Перазовы", „Лісьце трыпутніку", „Сьцяжок на мачце", „Акрыленая рэвалюцыяй".

BELORUSSIA IS ASTIR

Belorussia sings to me in native
Songs and dances. Belorussia speaks to
Me through written words to hold me captive
For a time in thought. And then a preview
Belorussia gives me in pictures that
I have seen. And Belorussia and her
People stand as one to meet each new day that
Dawns with zeal, for Belorussia is astir.

Paul Nedwell

May 26, 1970

Ад Рэдакцыі: Выжэй зьмешчаны верш паангельску Паўлы Нэдвэля, шчырага прыяцеля нашае газэты й ейнага падпішчыка, напісаны адмыслова для газэты „Беларус".

ДЗІЦЯЧЫ ЛЯГЕР НА БЭЛЕР-МЕНСКУ



Група дзяцей у летнім лягеры на Бэлер-Менску у часе заняткаў ручной працай. Фото: А. Протас

На беларускім рэсорце Бэлер-Менску адбыўся ад 16 да 24 жнівеня сёлета дзіцячы лягер, арганізаваны др. Вітаўтам Кіпелям. У праграму лягеру ўваходзілі: ручная праца, паходы, заняткі фізкультурай, спорт, гульні, танцы ды інш. Надвор'е было спрыяльнае. Дзеці прыемна й з карысьцяй правялі час.

Аднэй з галоўных атракцыяў лягеру былі сяброўскія вогнішчы, з мастацкай праграмай, арганізаванай і выконванай самымі дзецьмі. На разьвітальным вогнішчы пры ўдзеле дзяцей і бацькоў др. В. Кіпель адзначыў важнасьць летніх дзіцячых лягераў для нацыянальнага ўзгадаваньня моладзі, а прэзыдэнт карпарацыі сп. інж. Сяргей Рагалевіч запэўніў дзяцей і бацькоў, што Бэлер-Менск будзе заўсёды адчынены для гэткіх мерапрыёмстваў, як дзіцячыя лягеры, і запрасіў прадаўжаць гэтую карысную справу ў будучыні. Закончылася праграма лягеру супольным абедам бацькоў зь дзецьмі, у часе якога абмяркоўваліся праекты на будучыню.

Вялікая падзяка належыцца карпарацыі „Бэлер-Менск" за прыхільнае стаўленьне да дзіцячага лягеру, ягонаму арганізатару скаўтмайстру д-ру Вітаўту Кіпелю, а таксама спні Зоры Кіпель, і спадарству Аўгену й Марыі Несьцерам за ўсю працу, зьвязаную з правядзеньнем лягеру.

ДАРАГІЯ ГОСЬЦІ

16-20 ліпеня сёлета ў Лёс Анджэлесе прабываў вельмі паважаны а. Праньціш Чарняўскі, выдавец-рэдактар беларускага каталіцка-грамадзкага часапісу „Сяўбіт". Ксёндз Чарняўскі сьвяткуе сёлета 50-гадовы юбілей свайго сьвятарства. З гэтае нагоды атрымаў ён цімала віншаваньняў і пажаданьняў ад сваіх прыяцеляў і прыхільнікаў.

Ксёндз Чарняўскі ня першы раз наведаў Лёс Анджэлес. Шэсьць год таму ён быў мілым гасьцём у нас таксама. Сёлетняя ягоная візыта прыпала на час Тыдня Паняволеных Народаў. З гэтае нагоды ён ахвотна адслужыў Божую Службу пабеларуску ў мясцовай Украінскай Каталіцкай Царкве 19 ліпеня. Кс. Чарняўскі — наш гарачы патрыёт, што ахвяраваў сваё жыцьцё службе Богу й беларускай грамадзкай дзейнасьці. Жадаем і мы Беларусы Лёс Анджэлесу Яму доўгіх год жыцьця ды плённай працы на карысьць нашага народу.

⁂

20 ліпеня сёлета вечарам адбылася кароткая візыта ў Лёс Анджэлесе другога гасьця д-ра Уладзімера Бакуновіча. Д-р Бакуновіч — актыўны беларускі грамадзкі працаўнік у Дэтройце. Ён належыць да малодшага беларускага пакаленьня на чужыне, але добра арыентуецца ўва ўсіх беларускіх нацыянальных і палітычных справах. Ён робіць уражаньне энэргічнага й адданага беларускага патрыёта.

⁂

З 6 на 7 жнівеня сёлета наведала Лёс Анджэлес паважаная сп-ня Вольга Запруднік — жонка ведамага маладога беларускага гісторыка й журналістага д-ра Янкі Запрудніка. Сп-ня Вольга паінфармавала пра жыцьцё й грамадзкую дзейнасьць Беларусаў у Нью Ёрку. Яна зьяўляецца вельмі энэргічнай і адданай сваім удзелам у ньюёркаўскай беларускай грамадзе.

Н.

ШТО ЧУВАЦЬ?

З чатырнаццатага нумару бюлетэню „Хроніка бягучых падзеяў" савецкага падпольнага „Самвыдавецтва" даведваемся наступнае:

„7-га красавіка ў Менску быў забіты старшаклясьнік Максакаў. Паводля афіцыйнае вэрсіі, яго забіў п'яны хуліган. У забітага былі знойдзеныя лістоўкі з дамаганьнем дэмакратычных свабодаў. Праз колькі дзён, у дзень пахаваньня Максакава, група навучэнцаў старэйшых клясаў Менскіх школаў арганізавала ў цэнтры гораду на вуліцы Энгельса побач з ЦК КПБ дэманстрацыю.

„Дэманстранты сабраліся каля кінатэатру Навіны дня. Яны выпалілі аўтагенам на асфальце круг, і стаўшы ў яго, скандавалі лёзунгі з дамаганьнем свабоды слова і друку. Калі міліцыя пачала разганяць дэманстрантаў, яны пачалі крычаць: Гэта не Чэхаславаччына. Вы нас не разгоніце! Паводля чутак, некаторыя з дэманстрантаў былі выключаныя з школаў. У школах Менску былі праведзеныя камсамольскія сходы з мэтай павышэньня сьведамасьці".

„Днямі пачынаецца друкаваньне Другога Тому БелСэ, паведаміла газэта „Літаратура й Мастацтва (4. IX. 70, б. 9). У 2-ім томе закончацца артыкулы на літару „А", поўнасьцяй уключаныя матар'ялы на літару „Б" і частка на літару „В", усяго каля трох тысячаў артыкулаў. Друк другога тому БелСэ мае быць закончаны ў кастрычніку сёлета. „Рукапіс трэйцяга тому БелСэ, — піша „ЛіМ", — гатовы да друку, і на днях здаём у набор ягоную першую частку".

Анталёгія беларускае паэзіі ў польскім перакладзе „знаходзіцца ў вытворчасьці ў Лодзінскім выдавецтве, якое мае намер выдаць у бліжэйшым часе таксама ‚Анталёгію беларускае навэлі', „— паведаміла менская газэта „Літаратура і мастацтва" за 11 верасьня сёлета.

У Кіргізіі налічваецца больш за 4.613 Беларусаў (Кіргіская ССР мае ўсяго 2.933.000 жыхароў), падала газэта „Советская Белоруссия" за 3. IX. 70 г.

На беларускім адпачынкавым рэсорце Бэлер-Менск адбылася 9-га жнівеня арганізацыйная нарада студэнцкага актыву ў справе скліканьня першага зьезду й заснаваньня новае беларуска-амэрыканскае арганізацыі Беларусаў - выпускнікоў амэрыканскіх унівэрсытэтаў. На нарадзе выявілася, што ў ЗША, пачынаючы ад 1950 году скончыла ўнівэрсытэты каля 300 асобаў народжаных на Беларусі, а сёньня на амэрыканскіх ўнівэрсытэтах вучыцца каля 250 студэнтаў беларускага паходжаньня.

Рэцэньзію на кніжку Капыскага „Эканамічнае разьвіцьцё гарадоў Беларусі ў 16-м — 2-ой палавіне 18 стагодзьдзя" надрукаваў ведамы гісторык і дасьледнік Беларусі амэрыканскі праф. Бакус у часапісе „Славянскі агляд". Адзначаючы дадатныя бакі кніжкі Капыскага, праф. Бакус адначасна паказвае на заганы й слабыя мясьціны кніжкі ды аналізуе прычыны памылак і недакладнасьцяў.

Сёлета выйшаў з друку каталёг славянскіх калекцыяў бібліятэкі Манітобскага ўнівэрсытэту. Каталёг, складзены тэматычна, зьмяшчае цімала матар'ялаў і аб Беларусі ў розных мовах, у тым ліку і ў мове беларускай.Значная частка матар'ялаў бібліятэкі Манітобскага ўнівэрсытэту — гэта пераважна друкі лінгвістычныя, літаратурныя й гістарычныя. Ёсьць у гэтай калекцыі таксама й колькі рэдкіх кнігаў з часоў Вялікага Княства Літоўскага, у якіх шмат каштоўнага матар'ялу да вывучэньня гісторыі Беларусі.

Ізраэльскае Гістарычнае Таварыства, сэкцыя „Дасьледваньня гэбрэйскіх угрупаваньняў", выпусьціла ўлетку 1970 году ў Ерузаліме бібліяграфічны даведнік аб жыдоўскіх друках на тэрыторыі Савецкага Саюзу. Вельмі шмат выданьняў, паводле даведніка, было надрукована на Беларусі. Яны датычацца да ўзаемадачыненьняў паміж беларускім і жыдоўскім жыхарствам.

Бягучы агляд савецкага друку выдаецца ў амэрыканскім горадзе Калюмбусе ў штаце Агаё ўжо больш за 20 год як тыднёвы англамоўны часапіс. Дасьледнік Савецкага Саюзу наагул, а ў прыватнасьці дасьледнік Беларусі, знаходзіць у гэтым часапісе вельмі шмат цікавага матар'ялу, перакладаў з савецкіх выданьняў. Часапіс гэты выдаецца Амэрыканскай Асацыяцыяй Славянаведных навукаў ды зьмяшчае матар'ялы пра культуру, эканоміку, арганізацыйнае жыцьцё і адміністрацыйны апарат рэспублікаў Савецкага Саюзу. Гэтак, прыкладам, у жнівенскіх нумарох часапісу былі зьмешчаныя матар'ялы пра бюджэт Савецкае Беларусі, пэрсанальны склад Вярхоўнага Савету БССР ды апошнія падзеі ў будаўнічай прамысловасьці рэспублікі. Час-часом часапіс „Бягучы агляд савецкага друку" зьмяшчае таксама артыкулы пра культурныя падзеі на Беларусі ды на некаторыя важныя гістарычныя тэмы".

Выйшаў апошні том каталёгу кнігаў і картаў бібліятэкі Амэрыканскага Геаграфічнага Таварыства. У каталёгу дасьледнік можа знайсьці дзесяткі рэдкіх эканамічных, адміністрацыйных і палітычных картаў Беларусі, разьмешчаных у храналягічным парадку.

Кангрэсавая Бібліятэка ў Вашынгтоне выдала новы даведнік пэрыядычных выданьняў Савецкага Саюзу, якія знаходзяцца ў бібліятэках Злучаных Штатаў Амэрыкі. У даведніку, што абыймае пэрыяд 1918-1968 гадоў, пералічана цімала часапісаў і беларускіх. У даведніку адзначаныя беларускія часапісы, што выдаваліся ў Пецярбургу, Менску, Віцебску, а таксама навуковыя пэрыядычныя выданьні Акадэміі Навукаў БССР, Сельскагаспадарскай Беларускай Акадэміі ды Навуковых Таварыстваў у Менску й Магілеве. Усяго ў даведніку адзначана панад 50 беларускіх часапісаў.

КАМУНІКАТ № 1/70

БЕЛАРУСКАГА ВЫДАВЕЦКА-МАСТАЦКАГА КЛЮБУ „ПАГОНЯ"

Праведзены падлік касы „Пагоні". Леташні даход — 2,312.63 дал., выдаткі — 1,741.46 дал. Да 15 жнівеня сёлета ў касу паступіла 488.60 дал., выдаткавана — 1,129.24 дал. Білянс у касе — 223.24 дал. Нямала грошай выдадзена сёлета на сплату даўгоў ды на кружэлку песьняў, што мае выйсьці. З удзелам свае аркестры й сьпевака С. Шульгі падрыхтаваў яе Б. Лішчонак.

Управа „Пагоні" пастанавіла прапанаваць кажнаму сябры, каб узяўся прадаць прынамся па тры кружэлкі й па тры кнігі Акулавай аповесьці „Тумороў іс естэрдэй". Цана кніжкі й кружэлкі зьніжаная на адзін даляр.

Апрацоўваецца зусім новая кніга пра гісторыю Беларусі. Яна будзе перакладзеная на ангельскую мову й было-б добра выдаць яе сьпярша паангельску й адразу-ж пасьля гэтага — пабеларуску. Нам некаторыя закідалі, што мы абяцалі выдаць мапу Беларусі дый ня выдалі. Гэтта хочам выясьніць, што даўно сабраны патрэбны матар'ял, але ніяк ня можам знайсьці чалавека, якіб прафэсіянальна зрабіў яе за сыцілую ўзнагароду.

Сёлета зімою сп. К. Акула мае скончыць працу над другой кнігай „Гараваткі" — „Закрываўленае сонца". Выданьне дзьвюх ці трох гэтых кнігаў патрабуе вялікіх грошай. Пяршынство, аднак, аддаём выданьню гісторыі Беларусі. Усіх сяброў і суродзічаў, што маглі-б памагчы грашмі, просім адгукнуцца.

Вельмі шчыра дзякуем Д-ру В. Тумашу, што заплаціў ужо другую складку ў вышыні 50 дал. Хто наступны? Дзякуем сп.сп. М. Ніканy й М. Скабею з Аўстраліі, сп.сп. Ч. Будзьку й Л. Стагановічу із ЗША што спрычыніліся да павялічэньня сяброўства Клюбу й продажы нашых выданьняў. Вітаем у Клюбе сп. Б. Даніловіча, ведамага нашага працаўніка на ніве пашырэньня выданьняў. Запрашаем нашых сяброў пашыраць рады сяброў „Пагоні". Сёлета арганізуем узноў лятарэю, пра якую хутка паведамім дакладней.

Таронта, у верасьні 1970

Управа Клюбу „Пагоня"

Чытайце, выпісвайце, пашырайце часапіс Беларусаў у Вольным Сьвеце „БЕЛАРУС"

„БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛЯПЭДЫЯ" (1)

Ніводная беларуская кніга, што выйшла пасьля вайны, ды, хіба, і да вайны, ня мела гэтак шмат энтузіястычных рэцэньзіяў і водгукаў у друку, як першы том „Беларускай Савецкай Энцыклпэдыі", што выйшаў з друку летась. Выхад у сьвет гэтага тому ды пэўнасьць, што сьледам за ім будуць зьяўляцца й наступныя тамы (усіх тамоў мае быць 12), разглядаецца, як не абыякая падзея ў беларускім культурным жыцьці, а захапленьне й патрыятычная гордасьць ад гэтае падзеі ў некаторых рэцэньзіях і водгуках пераходзіць усякія межы, навет, калі паасобныя крытыкі знаходзяць у кнізе й некаторыя агрэхі й недакладнасьці.

З другога-ж боку, гэта зыркі паказальнік нязвычайна вузкага абмежаваньня дзеля разьвіцьця беларускае культуры, што адно на 52-ім годзе існаваньня „незалежнай" БССР партыя „ласкава" дазволіла й Беларусам мець сваю энцыклпэдыю. Таму застаецца адно паспачуваць беларускім пісьменьнікам і крытыкам з увагі на іхнае энтузіястычнае захапленьне й вялікую радасьць з гэтага выпадку, бо пры каляніяльным палажэньні БССР за рэдкае дасягненьне даводзіцца ім уважаць нат тое, што ў нармальных абставінах мусіла-б быць ужо даўным-даўно.

Бяручы ўвагу на гэтыя абставіны, першы том „Беларускай Савецкай Энцыклпэдыі", а гэткімі-ж, хіба, будуць і тамы наступныя, бясспрэчнае дасягненьне беларускае культуры й немалая заслуга ейных аўтараў і рэдакцыйнае калегіі на чале з галоўным рэдактарам паэтам Пятрусём Броўкам.

Тым ня менш, навуковую каштоўнасьць Энцыклпэдыі моцна абніжае агульная ў савецкіх абставінах палітычная тэндэнцыйнасьць галоўна ў распрацоўваньні тэмаў палітычных, сацыяльных, грамадзянскіх і часткава гуманітарных галінаў навукі й культуры, як у Савецкім Саюзе, гэтак і ў дачыненьні да г. зв. капіталістычнага сьвету. Але гэта ў Савецкім Саюзе зьява агульная й строга абавязваючая, за якую ані аўтараў, ані рэдактароў Энцыклпэдыі зьвінававаць нельга. Гэта проста вынік г. зв. марксыцка-ленінскага клясавага насьвятленьня зьяваў і падзеяў як мінуўшчыны, гэтак і сучаснасьці.

Але, апрача гэтае агульнае палітычнае тэндэнцыйнасьці, знаходзім у „Беларускай Савецкай Энцыклпэдыі" й некаторыя спэцыфічныя выпадкі палітычнай тэндэнцыйнасьці ў дачыненьні да некаторых зьяваў і асобаў. Перш-наперш датычыць гэта да канкрэтных асобаў беларускіх нацыянальных дэмакратаў або „нацдэмаў", што былі арыштаваныя й высланыя ў 20-ых — 30-ых гадох, або г. зв. беларускіх буржуазных нацыяналістых пазьнейшага часу. Тыя зь іх, што ў пачатку дэсталінізацыі былі рэгабілітаваныя, як, прыкладам, паэты Андрэй Аляксандровіч і Зьмітра Астапенка, у Энцыклпэдыі фігуруюць.

Затое тыя, што дасюль нярэгабілітаваныя, у Энцыклпэдыі ня згадваюцца зусім, як, прыкладам, выдатны бальшавіцкі дзеяч часоў грамадзянскае вайны, а ў 20-ых гадох ня менш выдатны дзяржаўны дзеяч БССР Алесь Адамовіч. Алесь Адамовіч займаў сваім часам вельмі адказныя кіраўнічыя становішчы: у савецка-польскую вайну ўзначальваў ваенна-рэвалюцыйныя трыбуналы Чырвонае арміі, а тады — у 20-ых гадох спачатку быў загадчыкам аддзелу друку ЦК КПБ, а пазьней — заступнікам народнага камісара земляробства БССР Зьмітра Прышчэпава. У 1930 годзе быў ён арыштаваны й высланы на Салаўкі, пасьля чаго ўсякі сьлед па ім загінуў.

Таксама ня фігуруе ў Энцыклпэдыі й ведамы драматург і тэатральны дзеяч Францішак Аляхновіч, што быў замардаваны ў 1943 годзе савецкімі агентамі ў Вільні. Трэба думаць, што гэткага прынцыпу будзе пасьлядоўна трымацца „Беларуская Савецкая Энцыклпэдыя" і ў наступных сваіх тамох, у сувязі з чым ня будуць у ёй згаданыя асобы, што адыгралі выдатную ролю ў гісторыі й культуры Беларусі, але арыштаваныя й высланыя ў гадох сталінскіх пагромаў, сяньня ня рэгабілітаваныя, як праф. Усевалад Ігнатоўскі, Вацлаў Ластоўскі-Власт, Антон Луцкевіч ды іншыя.

Затое г. зв. беларускія буржуазныя нацыяналістыя за мяжой, палітычна актыўныя пасьля мінулае вайны й дзякуючы гэтаму шырока ведамыя й жыхарству БССР, уведзеныя ў Энцыклпэдыю. Гэта — памерлы сёлета Прэзыдэнт Рады БНР Мікола Абрамчык і Прэзыдэнт БЦР Радаслаў Астроўскі. У тым, што абодвы названыя ў Энцыклпэдыі супрацоўнікамі заходняе разьведкі, нічога дзіўнага, бо гэткімі-ж называе савецкая прапаганда ўсіх Беларусаў, што знаходзяцца ў Вольным Сьвеце й актыўныя ў беларускім нацыянальным руху. Але прыпісваньне гэтым людзям дзейнасьці, зь якой яны ня мелі нічога супольнага, гэта ўжо сьвядомая й яўная дэзынфармацыя. Прыкладам, пра Міколу Абрамчыка сказана, што „на акупаванай нямецкімі фашыстымі тэрыторыі Беларусі ўзначальваў Беларускую народную самапомач". Тымчасам навет фізычна ня мог Мікола Абрамчык узначальваць Беларускай народнай самапомачы на акупаванай Беларусі, знаходзячыся на працягу ўсяе вайны на эміграцыі, ды ўзначальвалі гэную Самапомач зусім іншыя асобы — д-р Іван Ярмачэнка, а пазьней Юры Сабалеўскі.

Прывілей быць уведзеным у „Беларускую Савецкую Энцыклпэдыю", аднак, не расьцягваецца на пісьменьнікаў, навуковых і культурных працаўнікоў, што знаходзяцца ў Вольным Сьвеце й залічаныя да катэгорыі беларускіх буржуазных нацыяналістых. Гэтак у Энцыклпэдыі зусім ня фігуруе выдатная беларуская паэтка Натальля Арсеньнева, што жыве ў Задзіночаных Штатах Амэрыкі, мае за сабой багатую літаратурную прадукцыю ды актыўная ў паэзіі й сяньня. Навет беларускі савецкі крытык Вячаслаў Рагойша ў сваёй рэцэнзіі на Энцыклпэдыю ў „Літаратуры і Мастацтве" дакараў Рэдакцыю Энцыклпэдыі за тое, што абмінула ейнае прозьвішча.

Іншай палітычнай тэндэнцыяй „Беларускай Савецкай Энцыклпэдыі" — старэннае прамоўчваньне вынікаў сталінскага тэрору на Беларусі. У першым томе Энцыклпэдыі фігуруюць два рэгабілітаваныя ў першых гадох дэсталінізацыі беларускія паэты: Андрэй Аляксандровіч і Зьмітра Астапенка. Пра абодвых пададзеныя й важнейшыя біяграфічныя факты, але пра найважнейшыя з гэтых фактаў, што абодвы былі арыштаваныя й доўгія гады пакутавалі ў высылцы, ня згадваецца ніводным словам.

Усе гэтыя заганы „Беларускае Савецкае Энцыклпэдыі", як згадвалася ўжо, незалежныя ад ейных аўтараў і рэдактароў, у некаторай ступені рэкампэнсуюць бясспрэчныя ейныя пазытыўныя дасягненьні, пра якія будзе ход у наступным нашым артыкуле. Не зважаючы на ўсё ды бяручы ўвагу на палітычныя абставіны, у якіх зрыхтоўваецца гэтае выданьне, можна далучыцца да высокай ацэны „Беларускай Савецкай Энцыклпэдыі", дадзенай беларускімі крытыкамі й рэцэнзэнтамі ў БССР, як няштодзённай зьявы ў культурным жыцьці падсавецкай Беларусі.

Ст. Станкевіч

НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД "БЕЛАРУСА"

За папярэдні пэрыяд (ад 1 жніўня да 6 верасьня) наступілі ў касу нашае газэты падпіска й наступныя ахвяры на Выдавецкі Фонд „Беларуса":

1. Злажылі ўдзельнікі 9-ае Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі 6 верасьня 1970:

1.	Д-р Р. Гарошка	$ 50.00
2.	Д-р Ул. Набагез	50.00
3.	Д-р П. Гайдзель	30.00
4.	П. Манькоўскі	30.00
5.	М. Заморскі	25.00
6.	Д-р Я. Сажыч	20.00
7.	М. Кунцэвіч	20.00
8.	Я. Сурліва	20.00
9.	А. Грыцук	10.00
10.	П. Мірановіч	10.00
11.	Д-р Р. ЖукГрышкевіч	10.00
12.	П. Бартуль	10.00
13.	П. Алексы	10.00
14.	Д-р В. Жук-Грышкевіч	10.00
15.	Б. Данілюк	10.00
16.	Р. Б.	10.00
17.	М. Тулейка	10.00
18.	Ю. Корчык	10.00
19.	Уладыка Андрэй	10.00
20.	Д-р Я. Запруднік	10.00
21.	А. Ліхач	10.00
22.	А. К.	10.00
24.	П. Драздоўскі	10.00
25.	М. Гарошка	10.00
26.	В. Станкевіч	10.00
27.	В. Кажан	5.00
28.	А. Стрэчань	5.00
29.	А. Шукелайць	5.00
30.	Р. Станкевіч	5.00
31.	С. Гутырчык	5.00
32.	Л. Норык	5.00
33.	Я. Бруцкі	5.00
34.	А. Бжэнк	5.00
35.	У. Р.	5.00
36.	Л. Стагановіч	5.00
37.	М. Войтанка	5.00
38.	М. Алексеевіч	5.00
39.	Б. Даніловіч	5.00
40.	а. В. Кендыш	5.00
41.	М. Абрамчык	5.00
42.	Я. Азарка	5.00
43.	Я. Лукашэвіч	5.00
44.	К. Калоша	5.00
45.	А. Патапенка	5.00
46.	А. Міцкевіч	5.00
47.	В. Міцкевіч	5.00
48.	А. Мацукевіч	5.00
49.	У. Курыла	5.00
50.	Н. Орса	5.00
51.	Уладыка Мікалай	5.00
52.	С. Полацкі	5.00
53.	Д-р Я. Паўча	5.00
54.	А. Махноўская	5.00
55.	М. Ганько	5.00
56.	Г. Орса	3.00
57.	К. Каляда	3.00
58.	Я. Гайдэль	2.00
59.	Э. Пашкевіч	2.00
60.	П. Даўбачук	2.00
61.	Ф. Даніловіч	2.00
62.	С. Міровіч	2.00
63.	С. Рынкевіч	2.00
64.	Э. Зубковіч	1.00
65.	Г. Быстрымовіч	1.00
66.	К. Гіл	1.00
67.	В. Машанскі	1.00
68.	А. Стагановіч	1.00
69.	К. Акула	1.00
70.	А. Сарыкоўскі	1.00
71.	С. Красоўскі	1.00
72.	М. Страпко	1.00
73.	П. Гайдэль	1.00
74.	Я. Шлыстун	1.00
75.	8 ананімна па 1.00	8.00
		$ 607.00

2. Сабрана сп. С. Полацкім сярод Беларусаў Кліўленду:

76.	С. Полацкі	$ 30.00
77.	А. Стрэчань	25.00
78.	Ю. Станкевіч	20.00
79.	К. Калоша	20.00
80.	Я. Лукашэвіч	15.00
81.	М. Страпко	10.00
82.	Я. Раковіч	10.00
83.	Г. Кананчук	10.00
84.	Я. Бруцкі	10.00
85.	Я. Каваленка	10.00
86.	Уладыка Андрэй	10.00
87.	К. Каляда	5.00
88.	А. Яраховіч	5.00
89.	М. Гумен	5.00
90.	М. Ягаўдзік	5.00
91.	Ул. Дунец	5.00
92.	В. Семянчук	5.00
	Разам	**$ 200.00**

3. Перададзеныя Д-рам Я. Сажычам ад Беларусаў Дэтройту:

93.	Д-р Ул. Бакуновіч	$ 10.00
94.	М. Кумэйша	10.00
95.	М. Прускі	10.00
96.	В. Пляскач	10.00
	Разам:	**$ 40.00**

4. Сабраныя сп. А. Маркевічам сярод Беларусаў Канады:

97.	М. Ганько	12.00
98.	А. Жылік	10.00
99.	М. Буцька	10.00
100.	Л. Наркевіч	10.00
101.	А. Лабэцкі	7.00
102.	Я. Баран	6.00
103.	В. Прыстаўка	6.00
104.	В. Навіцкі	6.00
	Разам:	**$ 67.00**

5. Прыслана беспасярэдня ў Рэдакцыю:

105.	Д-р У. Набагез	$ 100.00
106.	М. Рагуля	50.00
107.	В. і М.	40.00
108.	У. Русак	20.00
109.	Д. Сямёнаў	15.00
110.	С. Блоцкі	10.00
111.	М. Жызьнеўскі	10.00
112.	Я. Арцюх	10.00
113.	В. Кажан	10.00
114.	Г. П.	10.00
115.	Я. Навагродзкі	6.00
116.	Ю. Найдзюк	6.00
117.	Ю. Найдзюк за сямейную хроніку.	4.00
118.	М. Віценчык, Ангельшчына	5.95
	Разам:	**$ 301.95**
	Усяго разам:	**$ 1,215.95**

Усім тым, што прыслалі грошы, Рэдакцыйная Калегія „Беларуса" выказвае шчырае беларускае дзякуй!